

Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 15 (894) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 15 КРАСАВІКА 1973 г. ЦАНА 60 гр.


Сцэна з каляровага і поўнага гумару «Вяселля» ў выкананні самадзейнікаў з Меляшкоў.

РЭНЕСАНС ТЭАТРАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Закончылася чарговае культурнае мерапрыемства БГКТ — агляд самадзейных драматычных калектываў. Цэнтральны агляд адбыўся 25 сакавіка г.г. на сцэне ў памяшканні Галоўнага праўлення ў Беластоку.

Цяжка правесці ацэнку беларускага аматарскага тэатральнага руху, так як не давялося мне пабачыць прынамсі большасці калектываў, выступаючых на павятовых сцэнах. Аднак сам факт, што ў сёлетнім аглядзе прыняло ўдзел аж 15 аматарскіх калектываў, сведчыць сам за сябе. Для параўнання трэба дадаць, што ў мінулым годзе да агляду прыступіла ўсяго 7 драмгурткоў. Гаворачы аб абыякавасці павятовых аддзелаў БГКТ да справы тэатральнага руху ў мінулым годзе, Вера Леўчук пісала: «Асабліва яскрава выйшла гэта ў Гайнаўскім павеце, як вядома, багатым беларускай культурнай дзейнасцю. Або Сакольскі павет — крыніца народных талентаў і форм. Не было там увогуле павятовых элімінацый».

І хто яго ведае, ці не вострыя словы аўтара публікацыі зрабілі тое, што ў гэтым годзе Гайнаўскі павет даказаў, што ён можа. На павятовай сцэне выступіла многа і добрых драматычных калектываў. Тыя, хто быў у Гайнаўцы на аглядзе, сцвярджалі, што артыстычны ўзровень драмгурткоў быў высокі. Багатую і разнастайную дзейнасць прадставіў Беластоцкі павет, адкуль на цэнтральным аглядзе выступіла аж тры калектывы. На жаль, з Сакольскага павету ізноў не было ніводнага драмгуртка.

Сёлетні цэнтральны агляд цешыць. Цешыць не толькі тое, што выступіла аж 6 калектываў, але і тое, што паказалі яны разнастайныя формы тэатральнай дзейнасці: п'есы, інсцэнізацыю і тэатр паэзіі.

Найбольшы эмацыянальны і драматургічны эфект выклікаў тэатральны калектыў з Паўлаў, які выступіў з пастаноўкай Б. Сачанкі «Ноч няволі». Зрэшты, паўлаўскі калектыў вядомы ўжо семнаццаць год, а акцёры-аматары дасканала выконвалі свае ролі. На маю думку, вельмі добра зайграў ролю Цярэшкі Лявон Бандарук у пастаноўцы «Трыбунал» А. Макаёнка, якую паставіў драмгурток з Вілянова Сямяціцкага павету. Адважуся нават сказаць, што Бандарук месцам быў ні ў чым не горшы ад прафесіянальнага акцёра.

Гарадок на гэты год быў наватарскі, прадстаўляючы тэатр паэзіі. Гэта форма тэатральнай дзейнасці ў беларускім аматарскім руху мала знаная. «У тыя дні» П. Глебкі ў выкананні гарадоцкіх аматараў былі першым тэатрам паэзіі ў гісторыі аглядаў беларускіх аматарскіх калектываў.


Старшыня ГП БГКТ (злева) уручае дыплом і ўзнагароду найлепшаму калектыву сёлетняга агляду з Кляшчэляў на рукі яго кіраўніка Расціслава Місеюка.

Драмгурток з Сакоў пад кіраўніцтвам А. Лазавік выставіў «10 гектараў» Я. Блізнюка і Ул. Цілюлькі.

Аднак найвялікшай неспадзеўкай сёлетняга агляду была інсцэнізацыя вяселля. З імі выступілі Дабрывода-Кляшчэлі і Меляшкі.

Калектыў з Дабрыводы-Кляшчэль паставіў п'есу «Несцерка» В. Вольскага. Гэта праўда, што тут найлепшым быў Расціслаў Місеюк, кіраўнік драмгуртка, які спаўняў вядучую ролю. Гаворачы пра дабрыводска-кляшчэлеўскую пастаноўку, трэба адзначыць вельмі простыя, але цудоўныя, каларытныя ўборы і дэкарацыю сцэны. Было гэта відовішча, як сказала адна з членаў журы, вельмі народнае, з народным гумарам. Спадабаўся таксама сцэнарый, які адзначаўся кампактнасцю, прыгожыя калектыўныя сцэны.

Дасканалую інсцэнізацыю паказалі жанчыны з Меляшкоў. Зіна Літвін, кіраўнік калектыву паставіла на сцэне звычайнае вясковае вяселле. Тут сцэнарый і змест былі абсалютна ўласнай работы — жывы фальклор. Гледзячы на меляшкоўскае вяселле, насоўваецца думка, што такія рэчы трэба запісваць і захоўваць. Гэта ж не толькі справа вяселля як такога, але справа абрадаў, песень, зразумела, багатага караваю. Як у кожным вяселлі, вядучы, стараста ці маршалак, гэта гумарыст, а народны гумар і багаты зместам, і смешны.

Сёлетні агляд насоўвае прапанову, каб чарговы агляд драматычных калектываў зрабіць пад лозунгам народнасці. На нашых вёсках былі цікавыя і прыгожыя святочныя абрады, масляніца, кудзельніцы і т.п. Гэта трэба знайсці сярод старэйшых кабет, запісаць і паказаць сучаснаму пакаленню.

Як і ў аглядзе песень на сцэне выступала шмат старэйшых аматараў. Асабліва гэта было відавочна ў вясельнай інсцэнізацыі з Кляшчэляў-Дабрыводы. і Меляшкоў. Гэта дадавала пастаноўкам сімпатычнай натуральнасці.

Журы пад кіраўніцтвам Ізабэлы Пултарак з Ваяводскага дома культуры першае месца прызнала тэатральнаму калектыву з Кляшчэляў-Дабрыводы за пастаноўку В. Вольскага «Несцерка». Другую ўзнагароду атрымалі Паўлы за «Ноч няволі» Б. Сачанкі. Трэцяга месца журы не прызнала нікому, а чацвёртае драмгуртку з Вілянова за пастаноўку А. Макаёнка «Трыбунал». Калек-

(Працяг на стар. 5)


Зала не змясціла ўсіх ахвотных паглядзець выступленні тэатральных калектываў. На першым плане журы агляду.

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У "Ніве"

Таленты з Арэшкава ● Сям'я Абрамовічаў ● Конкурс на найактыўнейшую вёску па карэспандэнцыі для «Нівы» ● Аб кніжцы пра Грамаду ● Фотарэпартаж з адкрыцця Ізбы народнай памяці ў бельскім ліцэі ● Беларускія тканіны ● Весткі з Боцькаў, Сакоў, Нетупы, Валілаў, Дубяжына, Бабікаў, Тафілаўцаў і Трасцянкі ● Вінныя прымаўкі.

II ПЛЕНУМ ГП БГКТ

Другое пленарнае пасяджэнне ГП БГКТ (1.IV.) прысвечана было працы праўленняў аддзелаў БГКТ з актывам. З дакладам прэзідыума выступіў старшыня ГП Мікалай Самоцік.

«БГКТ як масавая грамадская арганізацыя, — падкрэсліў дакладчык, — рэалізуючы ўказанні ПАРП, выконвае важную ролю ў актывізацыі рэгіёна ў галіне развіцця культуры і грамадска-гаспадарчага жыцця. Аб'ёмам сваёй дзейнасці таварыства ахоплівае тысячы грамадзян. Працу вядзе яно ў 190 гуртках, агулам сярод 5987 членаў.

Гурткі БГКТ з'яўляюцца апекунамі і ініцыятарамі культурнай працы ў 27 гмінных святліцах, 22 святліцах ОСП (пажарных каманд), у 62 клубах «Рух», у 32 клубах селяніна, 43 школьных цэнтрах культурнага жыцця. Гэта значыць, што нашы гурткі могуць паспяхова развіваць культурна-асветную дзейнасць у 185 святліцах і клубах, фінансуючыхся рознымі ўстановамі. Ёсць таксама магчымасці, каб карыстацца з кіназалаў, канферэнцыйных залаў ва ўстановах і з святліц, кіраваных іншымі арганізацыямі.»

Даныя гэтыя сведчаць аб тым, што ёсць дзе працаваць. І многія гурткі, як, напрыклад, гурток у Плёсках на Бельшчыне, прыкладна выкарыстоўвае мясцовы клуб і ўмела вядзе культурна-асветную працу ў сваім асяроддзі.

Дзякуючы добрай працы многіх гурткоў і актывістаў добра ўжо вырашаюцца даволі цяжкія заданні, як арганізаванне фэстынаў, аглядаў беларускай песні і драматычных гурткоў. Прыкладам гэтаму могуць паслужыць аддзелы ў Гайнаўцы, Бельску, Беластоцкім, Сямяціцкім паветах.

«Ёсць у нас адданы актыў, — сцвердзіў старшыня ГП. — Да перадавога актыву трэба залічыць членаў Галоўнага праўлення і членаў праўленняў аддзелаў з рэвізійнымі камісіямі. Сярод 205 членаў праўленняў аддзелаў 133 з'яўляюцца членамі ПАРП, 28 членам даверана функцыі радных, а 66 знахо-

Працяг на стар. 4

◆ Падзеі ◆ Здарэнні ◆ Факты ◆ Каментарыі ◆ Весткі



ЛЕПШ КІРАВАЦЬ ПРАМЫСЛОВАСЦЮ

У адпаведнасці з Дырэктывамі XXIV з'езду КПСС, якія прадугледжваюць пераход у прамысловасці на двух і трохзвеннявую сістэмы кіравання, узмацненне работы па канцэнтрацыі і каапераванню вытворчасці і па стварэнню буйных аб'яднанняў і камбінатаў з улікам асаблівасцей асобных галін, ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову «Аб некаторых мерапрыемствах па далейшаму ўдасканальванню кіравання прамысловасцю».

У пастанове гаворыцца, што пры ўдасканальванні арганізацыі кіравання прамысловасцю трэба зыходзіць з неабходнасці павышэння ўзроўню канцэнтрацыі вытворчасці асноўных відаў прадукцыі, развіцця навукова-тэхнічнай базы, спецыялізацыі і каапераваня аб'ядноўваемых прадпрыемстваў на аснове арганічнага злучэння ў адзіных гаспадарчых комплексах вытворчасці, навукова-даследчых і праектна-канструктарскіх арганізацый.

КАМУНІСТЫЧНЫ РУХ У ФРАНЦЫІ

Колькасць членаў Французскай камуністычнай партыі з часу яе XX з'езду ўзрасла на 39.107 чалавек.

✲

Нацыянальны савет Руху камуністычнай моладзі Францыі выказаў задавальненне вынікамі парламенцкіх выбараў, якія паказалі, што каля 11 мільёнаў французаў падтрымліваюць сумесную ўрадавую праграму левых сіл.

Нацыянальны савет прыняў таксама рашэнне аб правядзенні з 17 па 20 мая з'езду Руху камуністычнай моладзі.

РОСТ ЦЭН У ІТАЛІІ

У сярэднім на 28—30 працэнтаў узраслі ў Італіі рознічныя цэны за апошнія 12 месяцаў, паведамляе цэнтральны інстытут статыстыкі. Як адзначаюць італьянскія газеты, такі бурны рост дарагоўлі ў краіне не адзначаўся ўвесь пасляваенны перыяд.

У ОЛЬСТЭРЫ

Абстаноўка ў Ольстэры па-ранейшаму застаецца напружанай. У Бельфасце і Лондандэры, Арма і Н'юры не сціхаюць выстралы вінтовак і выбухі бомб. Штодзённыя сутычкі паміж англійскімі салдатамі і мясцовымі жыхарамі сталі звычайнай з'явай у Паўночнай Ірландыі.

Назіральнікі адзначаюць, што абстаноўка ў Ольстэры з таго часу, як уведзена прамое кіраванне з Лондана, значна пагоршылася.

НОВЫ ПАДАТАК У АНГЛІІ

У магазінах і на прадпрыемствах сферы абслугоўвання па ўсёй Англіі ў тэрміновым парадку мяняюць этыкеты з указаннем цэн на тавары і прэйскуранты тарыфаў паслуг. З 1 красавіка ў краіне, каб дагадзіць «Агульнаму рынку», уведзена новая сістэма падаткаабкладання — «падатак на прырошчаную вартасць», прыняты ў краінах ЕЭС. Гэтая сістэма, якая нясе выгады кампаніям, што працуюць на экспарт, вялікім цяжарам кладзецца на плечы радавога спажыўца, паколькі ўвядзенне новага падатку вядзе да значнага росту цэн на многія тавары першай неабходнасці, а таксама да павышэння тарыфаў на паслугі. (ак)

ВЯСНА НА ПОЛІ

З усіх куткоў Савецкай Беларусі паведамляюць аб распачаўшыхся палявых работах. Калгас «Прагрэс» адзін з першых у Гродзенскім раёне пачаў сяўбу ярыны. Ужо таксама распачалі сяўбу ў саўгасе імя Казлова, у калгасах «Чырвоная зорка», «Светлы шлях», «50-годдзя БССР» у Жлобінскім раёне і ў многіх іншых раёнах рэспублік. Хлебаробы Беларусі змагаюцца за высокі ўраджай. Яны добра падрыхтаваліся да сёлетняй пасяўной кампаніі.

РАБОЧЫ — ЛАЎРЭАТ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ

Слёсар Іван Пацярайчанка ўжо 20 гадоў працуе на Мінскім камбінаце будаўнічых матэрыялаў. За гэты час даводзілася яму выконваць многа складаных і адказных заданняў. За ўдзел у навукова-тэхнічнай распрацоўцы новых тэхналагічных працэсаў, за ўдзел у стварэнні і ўкараненні паточна-аўтаматызаваных канвеерных ліній па вытворчасці кірамічных плітак прысуджана яму Дзяржаўная прэмія СССР за 1972 год.

ВАДА — ГЭТА БАГАЦЦЕ

Некалькі год таму назад была ў Беларусі распрацавана і зацверджана генеральная схема комплекснага выкарыстання і аховы водных рэсурсаў. У адпаведнасці з гэтай схемай цяпер у Беларускім дзяржаўным інстытуце праектавання меліярацыйнага і воднагаспадарчага будаўніцтва дэталёва распрацоўваюцца мясцовыя схемы па басейнах асобных рэк. Напрыклад, водазбор ракі Беразіны складае 24 тысячы квадратных кіламетраў. Па ўсёй яго тэрыторыі будзе пабудаваных 37 вадасховішчаў ад 10 да 150 гектараў кожнае. Самыя буйныя з іх з'явяцца ў Докшыцкім, Бярэзінскім, Светлагорскім, Смалявіцкім і Кіраўскім раёнах. Да вады ў Беларусі адносяцца цяпер як да важнай крыніцы народнага багацця.

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР...

...з'яўляецца адной з буйнейшых навуковых устаноў у Савецкім Саюзе. Для плённай працы 11 тысяч яе супрацоўнікаў створаны выдатныя ўмовы: лабараторыі з сучасным абсталяваннем, фундаментальная бібліятэка, вылічальны цэнтр, канструктарскае бюро з доследнай вытворчасцю, атамны рэактар, выдавецтва і друкарня.

СТУДЭНТЫ-КАНСТРУКТАРЫ

У Мінскім радыётэхнічным інстытуце ўжо 5 год працуе студэнцкае канструктарскае бюро. Студэнты-старшакурснікі выконваюць чарцяжы і разлікі па стварэнню нестандартных прыстасаванняў і прыбораў па заказах прадпрыемстваў.

УЗНАГАРОДА ДЛЯ РЫГОРА ШЫРМЫ

За актыўны ўдзел у справе развіцця беларускай культуры і за дзейнасць па ўмацаванню дружбы паміж народамі Балгарыі і Савецкага Саюза ўрад НРБ узнагародзіў старшыню Саюза кампазітараў Беларусі і старшыню Беларускага таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом, народнага артыста СССР Рыгора Шырму ордэнам «Кірылы і Мефодыя» II ступені. Гэтую высокую ўзнагароду ўручыў ваенны аташэ пасольства НРБ у СССР, генерал-маёр П. Каракачанаў. (вр)

ЭДВАРД ГЕРЭК СЯРОД ВАЙСКОВЫХ

У мінулым тыдні І сакратар ЦК ПАРП Эдвард Герэк прымаў удзел у працы справаздачна-выбарнай канферэнцыі ПАРП Паморскай вайсковай акругі, якая адбылася ў Быдгашчы. Тав. Герэк выступіў з вялікай прамовай, у якой высока ацаніў дасягненні салдатаў Людовага Войска Польскага. «Прафесіянальныя кадры, а асабліва кожны афіцэр павінен быць палітычным дзеячом, які разумее, распаўсюджае і на практыцы рэалізуе ідэі партыі і народнай дзяржавы. Вы, таварышы, з'яўляецеся важным, моцна звязаным з рабочым класам і з партыяй атрадам народнай польскай інтэлігенцыі і кадраў нашай краіны», — сказаў ён. Эдвард Герэк наведаў выстаўку рацыяналізатарскіх прапаноў Паморскай вайсковай акругі.

ВУЧОНЫЯ ПОЛЬШЧЫ І ФРГ — АБ ШКОЛЬНЫХ ПАДРУЧНІКАХ

Ад 2-га да 5-га красавіка польскія і заходнегерманскія вучоныя — эксперты па справах перагляду школьных падручнікаў сустрэліся чарговы раз у Бруншвіку (ФРГ). На падставе прынятага ў кастрычніку 1972 года супольнага пагаднення былі зроблены спробы выпрацаваць гістарычныя тэзісы для навейшага і найбольш супярэчлівага перыяду гісторыі — менавіта ад 1945 года. Ужо раней былі абмеркаваны і апублікаваны 33 тэзісы, якія датычаць ранейшых важнейшых перыядаў у гісторыі польска-нямецкіх суадносін і канчаюцца перыядам акупацыі Польшчы і паражэння гітлераўскай Германіі. Наступная сустрэча польска-нямецкіх экспертаў павінна адбыцца ў пачатку восені ў Кракаве.

МАРАКІ ВЯРНУЛІСЯ ДАДОМУ

6 красавіка самалёт з Парыжа прывёз экіпаж маракоў карабля «Вроцлаў», які затануў у час моцнага шторму ў водах Міжземнага мора. На сігнал «СОС» з дапамогай прыйшоў французскі ваенны карабль, які ўзяў на свой борт польскіх маракоў. Маракі карабля «Вроцлаў» падкрэсліваюць нязвыклую адвагу і ўменні французскіх маракоў, якія рызыкуючы сваім жыццём, ратавалі польскіх калег.

ПІСЬМЕННІКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ КРАІН У ВАРШАВЕ

10 красавіка распачалася ў Варшаве чарговая — дзесятая сустрэча прадстаўнікоў саюзаў пісьменнікаў сацыялістычных краін. Мэта сустрэчы — практычны абмен вопытам у галіне развіцця сацыялістычнай літаратуры і супрацоўніцтва.

ПОЛЬШЧА — ЮГАСЛАВІЯ

7 красавіка вярнуўся з Белграда міністр замежных спраў Польшчы Стэфан Альшоўскі. У Югаславіі сустракаўся ён з прэзідэнтам Іосіфам Броз-Ціта, прэм'ер-міністрам Джамалам Біедзічам і іншымі кіраўнікамі краіны. Было абмеркавана шэраг міжнародных праблем, а сярод іх справы, звязаныя з еўрапейскай канферэнцыяй бяспекі і супрацоўніцтва, сітуацыя на Індакітайскім паўвостраве і на Блізкім Усходзе. (ач)

ПАРТКАНФЕРЭНЦЫЯ

6 красавіка ў Беластоку адбылася XIV Ваяводская справаздачна-выбарная канферэнцыя ПАРП. На канферэнцыю з'ехалася 275 дэлегатаў — прадстаўнікоў 60-тысячнай партыйнай арганізацыі нашага ваяводства. Сярод гасцей на канферэнцыі прысутнічалі сакратар ЦК ПАРП Е. Лукашэвіч, члены і намеснікі членаў ЦК ПАРП — міністр асветы і выхавання Е. Кубэрскі, дырэктар тэхнікума меліярацыі Л. Дэм'янюк, гаспадар з Высокамазавецкага павету С. Багуцкі, майстар з «Фаст» Ул. Лотыш, член Цэнтральнай рэвізійнай камісіі З. Аленяк, намеснік кіраўніка арганізацыйнага аддзела ЦК Г. Каніцкі, намеснік кіраўніка сельскагаспадарчага аддзела ЦК П. Іваноўскі, віцэ-міністр харчовай прамысловасці і скупу М. Дэмбагурскі і іншыя. Былі таксама прадстаўнікі ваяводскіх арганізацый ЗСЛ і СД, а таксама старшыня Прэзідыума ВРН З. Спрыха.

З дакладам аб эфектах дзейнасці ваяводскай партарганізацыі за апошнія гады выступіў І сакратар ВК ПАРП З. Куроўскі. «Каб поўнасцю адказаць на пытанне, як дзейнічаць далей, трэба спачатку ацаніць дасягненні і вопыт папярэдніх гадоў», — сказаў ён. Такую ацэнку і правёў Ваяводскі камітэт, а паглыбілі яе праведзеныя перад канферэнцыяй шырокія кансультацыі з актывам. Дзякуючы працавітасці і адданасці працоўных нашага ваяводства глабальная прадукцыя прамысловасці ўзрасла за 1971—72 гады на 23%, сельскагаспадарчая прадукцыя — на 14%. Вынікам гэтага быў узрост даходаў насельніцтва горада і вёскі на 34%. За высокую дынаміку ўзросту раслiннай і жывёльнай прадукцыі наша ваяводства сёлета атрымала права быць гаспадаром Цэнтральных дажынак. Аднак дасягнутыя вынікі не значаць, што зроблена ўжо ўсё магчымае. Галоўнае, на што трэба звярнуць увагу цяпер, гэта нізкая яшчэ прадукцыйнасць працы, кансерватызм некаторых сялян, недахопы ў арганізацыі працы, недахоп месц працы для жанчын, не вырашаны яшчэ пільныя бытавыя патрэбы людзей, асабліва жыллёвыя, паслуг і іншыя. Тэмпы далейшага хуткага развіцця нашага ваяводства, як падкрэслівалася ў дакладзе, залежаць будуць, па-першае, ад людзей, іх ведаў і ўмення; па-другое, ад поўнага выкарыстоўвання сродкаў; па-трэцяе, ад разумнага выкарыстоўвання часу.

У час дыскусіі выступіў сакратар ЦК ПАРП Е. Лукашэвіч. Ён падкрэсліў значныя поспехі, дасягнутыя за апошнія два гады ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці нашага ваяводства, звярнуў увагу на ўменне гаспадарыць людскімі рэзервамі, на ўменне падбіраць кіраўнічыя кадры. Партарганізацыі павінны ствараць умовы для ўключэння ўсіх людзей добрай волі ў выкананне нашых амбітных планаў — ператварыць Польшчу ў сучасную і высокаразвітую краіну.

На заканчэнне канферэнцыі была аднагалосна прынята праграма дзейнасці Беластоцкай ваяводскай партарганізацыі на 1973—74 гады. Дэлегаты канферэнцыі выбралі новыя партыйныя ўлады. І сакратаром ВК ПАРП быў ізноў выбраны З. Куроўскі. (яч)



Niedziela 15.IV.

7.40 Program dnia. 7.45 TV Kurs Rolniczy. 8.20 „Przypominamy, radzimy". 8.30 „Nowoczesność w domu i zagrodzie". 9.00 TELERANEK. 10.20 „Serengeti nie umiera" — film dok. ang. („Świat, który nie może zaginąć"). 10.45 „W obiektywie". 11.15 „Muzy bez etatu". 11.45 Dziennik. 12.00 Sprawozdanie z II połowy meczu piłki nożnej Legia (Warszawa)—Zagłębie (Sosnowiec). 12.45 „Przemiany". 13.15 Dla dzieci: M. Kann — „Malwinka". 14.00 Losowanie Totolotka. 14.15 „Spotkanie z Turkiem" — rep. 14.55 „Piosenka dla Ciebie". 15.45 Mistrzostwa Świata w hokeju na lodzie. Zw. Radziecki—Szwecja. 17.40 „Pseudonim Skręt" („Znaki zapytania") — film o Stanisławie Schwallenbergu. 18.20 „Pojedynek 2" — runda II (Tadeusz Ross i Jacek Żemantowski"). 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Komedia ludzka" — film pol.-franc. („Wielka miłość Balzaka") odc. IV. 21.00 PKF. 21.10 Teatr Nieduży Jeremiego Przybory. Na scenie Średniej: „X-3333". 22.00 Magazyn sportowy.

Poniedziałek 16.IV.

12.45 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin. 15.20 i 22.50 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Fizyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Zwierzyniec". 17.20 Dla dzieci: „Obserwatorium". 17.30 „Echo stadionu". 17.55 TV Kurier Kielecki. 18.10 „Oferty". 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Eureka". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr TV: A. Miller — „Wszyscy moi synowie". 21.35 „Ex libris". 22.05 Dziennik. 22.25 Gra Charles Treger — skrzypce.

Wtorek 17.IV.

10.00 „Komedia ludzka" — film pol.-franc. (Wielka miłość Balzaka") odc. IV. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEWIZJA MŁODYCH. 18.20 TV Kurier Mazowiecki. 18.40 POLITYKA DLA WSZYSTKICH. 19.10 „Przypominamy, radzimy", 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Dziewczyna o zielonych oczach" — film fab. ang. 21.35 „Kontakty". 22.05 Dziennik. 22.25 „Za kierownicą". 23.00 TV Technikum Rolnicze: Matematyka. 23.35 TV Technikum Rolnicze: Uprawa roślin.

Środa 18.IV.

10.00 „Dziewczyna o zielonych oczach" — film fab. ang. 12.45 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 13.25 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt. 14.00 „Wybieramy zawód". 15.20 i 23.30 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Matematyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 Dla młodych widzów: „Zagrajmy w..." 17.10 Dla dzieci: „Małe kino". 17.35 „Informacje, Towary. Propozycje". 17.55 „Getto" — film. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Rodzina". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.00 Studio 63: M. Żuławski — „Deszcz" („Opowieści mojej żony"). 20.15 „Wśród obcych" — film radz. („Cienie zanikają w południe") odc. II. 21.35 „Świat i Polska". 22.15 „Artyści, których podziwiamy" — Feliks Rączkowski. 23.00 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Czwartek 19.IV.

10.00 „Wśród obcych" — film radz. („Cienie zanikają w południe") odc. II. 16.15 Program dnia. 16.20 PKF. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEFERIE. 17.40 „Poligon". 18.05 TV Kurier Mazowiecki. 18.20 Program okolicznościowy. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.00 „Przypominamy, radzimy". 20.10 Teatr TV: E. D. Biggers — „Za kurtyną". 21.15 „Bez togi". 21.55 „Ekspres nr. 24". 22.25 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.55 TV Technikum Rolnicze: Zoologia. 23.30 TV Technikum Rolnicze: Hodowla zwierząt.

Piątek 20.IV.

10.00 „Wilcze echa" — film fab. pol. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEFERIE. 17.40 „Nie tylko dla pań". 18.00 „Turystyka i wypoczynek". 18.10 „Joachim Grubich gra na organach Bazyliki w Leżajsku" — film TVP. 18.25 TV Kurier Warszawski. 18.45 „Perspektywy techniki". 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.00 „Niczego mi nie żal..." — muzyczna biografia Edith Piaff. 21.00 „Panorama". 21.40 Teatr TV: A. Świętochowski — „Błazen". 22.25 Dziennik.

Sobota 21.IV.

10.00 FILMY Z GRETĄ GARBO: „ Królowa Krystyna" — film. 13.40 Program dnia. 13.45 Sportowy magazyn sprawozdawczy. 15.40 Program I proponuje. 16.05 Telereklama. 16.30 Dziennik. 16.40 TELEFERIE. 17.40 „Spotkania z przyrodą". 18.40 „Pegaz". 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 Bella Dawidowicz (ZSRR) gra utwory Fryderyka Chopina. 20.35 Teatr Rozrywki: H. Sienkiewicz — „Ta trzecia". 21.45 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.10 FILMY Z GRETĄ GARBO: „Królowa Krystyna" — film.



Piątek, 13 kwietnia

8.45 Film fab. 10.20 Filmy dokument. 11.00 Szkoła szachowa. 13.50 Program dnia. 13.55 Hokej. Szwecja—Finlandia. 17.00 Czas. 17.25 Hokej. ZSRR—Czechosłowacja. 20.45 Hokej. Szwecja—Finlandia. 3 tercja.

Sobota, 14 kwietnia

7.00 Program dnia. 8.00 Przegląd międzynarodowy. 8.15 Mozaika muzyczna. 8.30 Film dokument. 10.00 Film fab. 12.40 W świecie zwierząt. 14.00 Spotkania muzyczne. 14.40 Filmy animowane. 16.25 Tańczcie z nami. 17.35 Spektakl TV. Część I. 19.00 Czas. 19.30 Spektakl TV. Część II. 20.40 Piłka nożna. „Dynamo" (Tbilisi)—„Dynamo" (Kijów). 2 połowa. Hokej. NRF—Polska. 3 tercja

Niedziela, 15 kwietnia

7.00 Program dnia. 8.00 Dla żołnierzy. 8.30 Kiosk muzyczny. 9.00 Filmy animowane. 10.00 Białe i czarne. 11.55 Hokej. Czechosłowacja—Finlandia. 14.25 Klub filmowy. 15.25 Hokej. ZSRR—Szwecja. 19.00 Czas. 19.30 Teatr miniatur. 20.35 Sala tańców. 21.10 Piłka nożna „Szachtior" (Donieck) —„Dynamo" (Moskwa). 2 połowa.

У ЛАБАРАТОРЫЯХ ВУЧОНЫХ



Паверхня вялікай контурнай карты Еўропы ўсеяна дробненькімі рознакаляровымі лічбамі і нейкімі незвычайнымі таямнічымі значкамі.

— Можа вы хацелі б ведаць, якое сёння надвор'е ў Мінску, Маскве, Парыжы ці на далёкім Шпіцбергене? — звяртаецца да мяне мгр інж. Юзэф Івінскі — кіраўнік беластоцкага аддзела Інстытута метэаралогіі і воднай гаспадаркі. — Калі ласка, сёння мінчанкі мусілі апрануць цёплае паліто і ўзяць з сабой парасоны, бо раніца была халодная — — дзьмуў паўночна-заходні вецер, перападаў дождж са снегам. А ў Парыжы ранак быў даволі прыгожы: шэсць градусаў цяпла, ціха, свяціла сонца. Затое на Шпіцбергене бушавала снегавая навальніца...

Пад спрактыкаваным вокам Ю. Івінскага рознакаляровыя лічбы і значкі, што на карце, адкрываюць свае таямніцы. З іх ён чытае сілу і напрамак ветру, вышыню і тоўшчу хмараў, ападкі, тэмпературу і іншыя дадзеныя аб стане надвор'я ва ўсёй Еўропе. Праз цэлыя суткі, днём і ноччу, круглы год, кожную гадзіну паяўляецца новая карта з новымі значкамі. У той жа час беластоцкі аддзел інстытута перадае ў цэнтр, і адтуль ідуць на ўсю Еўропу дадзеныя аб надвор'і, якое пануе на Беласточчыне. Стракацяць тэлетайпы, гудзяць сінаптографы, адзываюцца пазыўныя радыёстанцый, няспынна працуюць дзесяткі людзей.

— Але нашая праца не абмяжоўваецца толькі да спраў надвор'я. Сабраць дадзеныя з шасці метэастанцый, падлеглых нашаму аддзелу, апрацаваць іх, перадаць у цэнтр, вызначыць надвор'е для нашага рэгіёну на бліжэйшыя суткі (прагнозы на даўжэйшыя тэрміны акрэсліваюць сіноптыкі ў Варшаве) — гэта ўсё ж невялікі адрэзак нашай дзейнасці, — заўважае Ю. Івінскі. — Нядаўна наступіла аб'яднанне ранейшага Дзяржаўнага гідралагічна - метэаралагічнага інстытута з Інстытутам воднай гаспадаркі. У выніку паўстаў Інстытут метэаралогіі і воднай гаспадаркі, падпарадкаваны Міністэрству сельскай гаспадаркі. Рашэнне правільнае. Як вядома, справа інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай прадукцыі мае ў нашай краіне цэнтральнае значэнне. А высокія ўраджаі і добрая гадоўля дабытку залежыць ад умення гаспадарыць, а таксама ад колькасці вады і надвор'я.


Таму наш аддзел інстытута займаецца збіраннем з паўночна-ўсходніх абшараў Польшчы (з басейну ракі Нарвы — ваяводства Беластоцкае і частка Ольштынскага і Варшаўскага) дадзеных аб стане вод у рэках, рэчках і азёрах, узроўні грунтовых водаў, рознага роду кліматычных дадзеных — тэмпература паветра, ціск, вільготнасць, напрамкі і сіла ветру, воблачнасць, глыбіня замярзання грунту і іншыя фактары — вельмі важных для ўсёй народнай гаспадаркі. Збіраем мы ўсё гэта скрупулёзна і сістэматычна, апрацоўваем, накапляем і прадстаўляем да карыстання навуковым установам і праектным бюро, словам, усім, каму гэтыя дадзеныя неабходны. Гэта вельмі каштоўны матэрыял, ад правільнага выкарыстання якога залежыць, ці новы завод будзе ўданай інвестыцыяй і ці новы сорт жыта дасць добры ўраджай, ці новы дом будзе трывалы ды цёплы і ці новая парода быдла дасць больш малака і прыросту мяса. Гэта толькі для прыкладу, наколькі важныя дадзеныя, якія мы маем у нашым «банку інфармацыі».

— Ці праводзіце і навуковыя доследы?

— Так, і нават даволі шырокія. Перш за ўсё праводзім аграметэаралагічныя доследы над уплывам клімату на розныя сарты збожжа, над прымяненнем розных форм і колькасцей угнаення (для гэтага маем спецыяльныя доследныя палеткі). Вывучаем водныя рэсурсы меліяраваных абшараў і тых, якія будуць меліяраваны. Даследуем водныя багацці грунту, рэк і азёраў. На аснове сабранага матэрыялу апрацоўваем указанні для прамысловых і сельскагаспадарчых інвестыцый, дбаючы пра тое, каб яны не парушылі законаў пануючай у прыродзе раўнавагі. Значыць: каб чалавек не шкодзіў сам сабе.

— Што новага ў польскай метэаралогіі і воднай гаспадарцы?

— Перш за ўсё паўстае Нацыянальны метэаралагічны цэнтр. Гэта будзе ўстанова, абсталяваная па апошняму слову сучаснай тэхнікі, з электроннымі вылічальнымі машынамі, сістэмай каблевай сувязі ўсіх метэастанцый краіны з цэнтрам і шэрагам іншых самых новых тэхнічных прыладаў. Цяпер мы праводзім інтэнсіўную падрыхтоўку кадраў да працы з новай апаратурай і паводле самых сучасных вымаганняў, бо ад 1975 года Нацыянальны метэаралагічны цэнтр будзе ўжо дзейнічаць.



Мгр інж. Ю. Івінскі правярае працу адной з установак метэаралагічнай станцыі ў Беластоку.

Калі я развітваўся з мгр інж. Ю. Івінскім, двое працаўнікоў прымалі з сінаптографа актуальную карту пагоды з раёну Штакгольма. Ізабары і ізатэрмы на толькі што прынятай карце надвор'я на Шпіцбергене гаварылі, што снежны буран там крыху суцішыўся. Лётчык санітарнага самалёта пытаўся па тэлефону пра пагоду ў Варшаве — меў ляцець з цяжка хворым чалавекам з Бельска ў Варшаву. У Беластоку ж панавала прыгожае сонечнае прадвесне.

Агульны выгляд будынка беластоцкага аддзела Інстытута метэаралогіі і воднай гаспадаркі.

Мікалай Гайдук
Фота аўтара



АБ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ — У ЧЭХАСЛАВАКІІ

У сувязі з 50-годдзем Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, у Празе надрукавана праца «Кароткі нарыс гісторыі беларускай літаратуры». Напісаў яе вядомы вучоны і папулярызатар беларускай літаратуры ў Чэхаславакіі др Вацлаў Жыдліцкі, прафесар Карлавага універсітэта.

Характарызуючы ўмовы, у якіх адрадзілася беларускае пісьменства ў XIX стагоддзі — др Жыдліцкі піша:

(...) Мартыралогія беларускай літаратуры сваімі размерамі перавысіла ўсе цяжкія выпрабаванні славянскіх літаратур. У тыя часы не было такога аўтара, які б не прайшоў праз турму, выгнанне або паліцэйскія праследаванні. Многія заўчасна паміралі, не ўбачыўшы сваіх твораў у друку, а яшчэ часцей пакідалі па сабе толькі зачаткі».

Аўтар нарыса, упамінаючы пра ўсіх беларускіх пісьменнікаў, спыняецца даўжэй на творчасці Дуніна-Марцінкевіча, Кастуся Каліноўскага, Францішка Багушэвіча, Янкі Лучыны.

Асобным раздзелам працы з'яўляецца «Нашаніўская» пара (1905-1919 гады).

«Карацей кажучы, — піша аб гэтым перыядзе Жыдліцкі, — узнік патрэбны творчы настрой, плённае літаратурнае жыццё. Тады пісьменства беларусаў прыцягнула ўвагу заграніцы, асабліва ў славянскім свеце, а перш за ўсё ў нас, дзе асабліва сардэчна цікавіўся ім Адальф Чэрны ў сваім «Слёванскім пжэгледзе».

Жыдліцкі падрабязней ахарактарызоўвае творчасць Янкі Купалы, Максіма Багдановіча (...«які ўзброены дакладным веданнем еўрапейскай паэзіі памастацку «ўклаў» беларускае слова ў класічныя і новыя формы»...), Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага.

Пішучы пра савецкі перыяд, Жыдліцкі не абмінуў ніводнага, вартага ўвагі прозвішча. Гэты раздзел яго працы найбольш багаты. У заканчэнні аўтар выказвае сваё агульнае адчуванне творчасці таго пакалення, якое прыйшло ў літаратуру пасля XX з'езду КПСС.

«Маладыя аўтары не ўтвараюць ніякай уласнай школы, не аб'яднаны яны стылем ці нейкай тэмай; пераважае ў іх натуральная арыентацыя на сучаснасць з пэўнай схільнасцю да вяртанняў у ваеннае дзяцінства ды маладосць. Аднак, праграмна агульнае ім пярэчанне якому-кольвек дагматызму і засяроджанне на галоўным аб'екце мастацтва — чалавеку. Прытым, цікавіць іх у чалавеку перш за ўсё яго нутро, яго этычная постаць. Разам з тым удзяляюць больш увагі працэсам, чымсьці вынікам. У першую чаргу, працэсам станаўлення характару.

І яшчэ адно трэба сказаць аб маладым пакаленні: што сваім падыходам унесла ў беларускі літаратурны працэс нечуваную дынаміку, а сваімі поглядамі захапіла і многіх старэйшых пісьменнікаў.

Дзякуючы такому ажыўленню, у канчатковым выніку замацавалася аб'яднанне з агульнаеўрапейскім літаратурным кантэкстам. Сучасная беларуская літаратура дасягнула ўзроўню, аб якім некалі сніў М. Багдановіч, калі казаў, што «нясе свой дар усёй людскасці».

Жыдліцкі склаў спісак кніжак беларускіх пісьменнікаў, якія выйшлі ў перакладзе на чэшскую або славацкую мовы. Усіх — семнаццаць. Няшмат. Найбольш — Быкава, Мележа і Коласа. У «Слоўніку пісьменнікаў народаў СССР», які выйшаў на чэшскай мове ў 1966 годзе, надрукаваны 143 артыкулы пра беларускіх аўтараў.

У чацвёртым нумары часопіса «Ruský jazyk» ад 1972 г. др Вацлаў Жыдліцкі змясціў артыкул «Юбілейны год беларускай літаратуры», прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Часопіс гэты прызначаны для настаўнікаў рускай мовы ў школах Чэхаславакіі.


Сакрат Яновіч

Dr Václav Židlický. Stručný nástin dějin běloruské literatury. Praha 1973.

Этнаграфічнае акенца



Вёска Ячна Дуброўскага павету. Фота Я. Цялушэцкага



Магіла ў Лядскай пушчы

Адгрымеў фронт. Пад Гайнаўкай засталося асабліва многа развалін і папялішчаў, бо савецкія войскі заўзята там абараняліся, а гітлераўцы за гэта мсціліся на мясцовым насельніцтве. Такім чынам пайшлі з дымам Старое Беразова, Дубічы і іншыя вёскі. Адначасова ў гэтых вёсках палі першыя ахвяры гітлераўскага злачынства.

Людзі аднак яшчэ добра не пазналі варварскага аблічча гітлераўскага фашызму. Гаварылі: што ж, фронт, а ў час бою featured рознае здараецца...

Першыя тыдні акупацыі прайшлі тады ў атмасферы напружанага чакання: што будзе далей? Немцы ўстанавілі солтысаў у вёсках і амсткамісараў у гмінах, а ў Белавежы абсталяваўся паліцэйскі батальён 322. І тады пачалося...

Аб злачынствах гэтага батальёна расказвалі мы чытачам на старонках «Нівы» летам 1971 года. Акруговая камісія па даследаванню гітлераўскіх злачынстваў таксама занялася «справай шуцпаліцэйскага батальёна 322». У выніку шматгадовага ды падрабязнага даследавання «справы» суддзя, магістр Галіна Дамашэвіч 1 снежня 1972 года склала наступны акт абвінавачання:

«Прапаную паставіць перад судом:

1) Групенфюрэра СС Фон дэм Баха Залеўскага — вышэйшага камандзіра СС і паліцыі «Расія-Міттэ», якому ад 24 ліпеня 1941 года да 6 верасня 1941 года непасрэдна быў падпарадкаваны батальён 322.

2) Надэля — маёра шуцпаліцай, які камандаваў батальёнам 322.

3) Бінца — капітана шуцпаліцай.

4) Ёрке — капітана шуцпаліцай.

5) Ліпмана — капітана шуцпаліцай.

6) Фромбсдорфа — старшага лейтэнанта шуцпаліцай (...)»

...і так чаргуюцца прозвішчы гэтых злачынцаў — ад афіцэраў аж да радавых. Усіх разам 83. Зразумела, у саставе батальёна 322 было іх многа больш. Не ўсіх пакуль што ўдалося ўстанавіць. Аднак цэлы свет хай ведае хаця б і пра гэтых, хай людзі ведаюць, што яны:

«(...) I. ад 23 да 31 ліпеня 1941 года, служачы ў батальёне 322, кіруючыся нацыянальнай нянавісцю і нікчэмнымі матывамі, расстралялі каля касцёла ў Нарве Якуба Смактуновіча і Рыгора Вайкоўскага.

II. 31 ліпеня 1941 г., служачы ў батальёне 322, кіруючыся нацыянальнай нянавісцю і нікчэмнымі матывамі, загадалі з'явіцца ў Нарву Гайнаўскага павету:

Уладзіміру Петручуку,
Міхаілу Гаўрылюку,
Піліпу Асташэўскаму,
Якубу Галёнку, (...)
(і 39 іншым грамадзянам),

ды пасля вывезлі ўсіх разам на аўтамабілі ў 19-ы квартал Лядскай пушчы і там усіх расстралялі...»

Гэта ў лесе непадалёк за вёскай Ваські. Цяпер там стаіць скромны помнік, але тады гітлераўскія каты ўсё рабілі, каб і следу не засталося пасля свайго злачынства.

Дзімітр Снарскі расказвае:

— Жыў я ў Нарве. 30 ліпеня пасланец прынёс мне павестку, каб на другі дзень з'явіцца ў гміну для праверкі дакументаў. Гэтага паведамлення я аднак не прыняў і сам схаваўся ў лесе. Цяпер ведаю, што такім чынам выратаваўся ад смерці. Бо тых, хто прыйшоў у Нарву, нібы для праверкі дакументаў, расстралялі ўсіх да аднаго. Бачыў я, як везлі іх на аўтамабілі, а пасля чуў кулямётную стральбу. Вечарам пайшоў на гэтае месца. Гітлераўцы ўсё тут старанна замаскавалі. На свежую магілу нанасілі моху і галля, а нават пасадзілі маладую елку... Расстраляныя людзі выводзіліся з Нарвы, Паўлаў, Сацоў, Трасцянкі, Тыневіч, Крыўца, Ласінкі, Клейнік і іншых навакольных вёсак. Усе яны пры савецкай уладзе былі актывістамі.



Сцяпан Кірылюк з вёскі Сацы.

У супольнай магіле знайшлася адна жанчына — Вольга Семянюк, якая «пры Саветах», як кажуць у нас людзі, была старшынёю сельсавета ў Агароднічках. Пра яе расказвае дачка Анна, якая па мужу называецца Ясюк і жыве ў Трасцянцы:

— Калі прыйшлі немцы, дык праз некалькі тыдняў загадалі маме з'явіцца ў Нарву, у гміну. Мама туды пайшла і ўжо не вярнулася. Яе расстралялі на ўскраіне Лядскай пушчы, дзе цяпер знаходзіцца помнік. Яе цела мы адкапалі на другі дзень пасля расстрэлу і перавезлі на могільнік у Трасцянцы. Куля трапіла маме ў галаву, каля правага вока.

Падобных выказванняў па справе батальёна 322 ёсць многа. Суддзя, магістр Галіна Дамашэвіч разам з пракурорам Манкевічам сабралі багаты матэрыял, які без ніякіх сумненняў характарызуе разбойніцкую дзейнасць «рыцараў новага парадку». Ніякі суд на свеце не можа апраўдаць гэтых злачынцаў. На жаль, знаходзяцца яны там, куды рука нашага правасуддзя ўжо не дасягае. Дык Акруговая камісія па даследаванню гітлераўскіх злачынстваў зрабіла, што толькі магла. Яна перадала справу судовым органам ФРГ. Ці яны скарыстаюць з гэтых доказаў — гэта ўжо іх справа. Мы можам толькі аб'явіць свету, што аб ахвярах гітлераўскага тэрору ніколі не забудзем.

На здымках мы бачым некаторых ахвяр гітлераўскага злачынства. Гэта людзі, якія былі расстраляны 31 ліпеня 1941 года.



Пётр Кур'яновіч з Нарвы.



Цімафей Садоўскі з вёскі Тыневічы Вялікія.



Сцяпан Байтручук з вёскі Клейнікі.



Уладзімір Крэнтоўскі з вёскі Ваські.



Ананій Гаўрылюк з вёскі Клейнікі.



Мікалай Раманюк з вёскі Крывец.



Серафім Яканюк з вёскі Канюкі.

Віктар Рудчык
Фота архіў АКДГЗ у Беластоку

Працяг са стар. 1)

II пленум ГП БГКТ

дзіцца на кіруючых пасадах у розных установах, прадпрыемствах і арганізацыях. Сярод іх 103 асобы маюць сярэднюю адукацыю, а 53 — вышэйшую.

На высокім агульным і прафесіянальным узроўні знаходзіцца наш актыў у літаратурным аб'яднанні «Белавежа» і рэдакцыя «Ніва». Гэты актыў уносіць найбольш ведаў непасрэдна ў гурткі з галіны беларускай культуры і літаратуры. Аўтарскія сустрэчы літаратараў і журналістаў заўсёды карыстаюцца зацікаўленнем у грамадстве і адбываюцца пры запоўненых залах.

БГКТ мае шмат дасягненняў, мае многа добрых прыкладаў працы актыву, гурткоў і аддзелаў. Адначасова ёсць таксама нямала недахопаў, да якіх перш за ўсё трэба залічыць недастатковую дзейнасць сакольскага і дуброўскага аддзелаў і недастатковую абслугу гурткоў БГКТ актывістамі».

У дакладзе шмат увагі прысвечана набліжаючымся ў Беластоку Цэнтральным дажынкам, а таксама святкаванню 30-ай гадавіны Народнай Польшчы.

У канцовай частцы даклада былі прадстаўлены заданні для Прэзідыума ГП, членаў ГП, аддзелаў, гурткоў, актывістаў, рэдакцыі «Ніва». А вось некалькі з іх: а) Галоўнае праўленне БГКТ шырэй узніме тэму культуры вёскі і горада, іх парадку і эстэтыкі. б) Прэзідыум ГП БГКТ абавязаны арганізаваць часцей сустрэчы актывістаў ГП з актывістамі праўленняў аддзелаў непасрэдна ў гуртках, дыскутуючы на найбольш актуальныя тэмы таварыства і грамадска-гаспадарчыя тэмы. в) Праўленні аддзелаў павінны ўзнімаць шляхам конкурсаў беларускі фальклор у розных формах, павінны шырэй папулярызаваць фэстыны як свецкія мерапрыемствы, павінны мабілізаваць вёскі да арганізавання зялёных нядзеляў — высаджвання вёскі і дарог дрэвамі, а няўжыткаў — лесам, г) Рэдакцыя «Нівы» ўзмоцніць дзейнасць у галіне папулярызацыі людзей добрай работы на карысць асяроддзя.

Пасля даклада распачалася плённая дыскусія.

Старшыня гайнаўскага аддзела Аляксандр Іванюк гаварыў аб карысным супрацоўніцтве праўлення з аддзелам культуры Прэзідыума ПРН і аб неабходных нарадах старшынь гурткоў і актыву, у тым ліку і гміннага актыву БГКТ.

Янка Цялушэцкі — старшыня павятовага беластоцкага аддзела БГКТ расказаў, як іх аддзел разгарнуў шырокую дзейнасць на вёсках і дзякуючы гэтай дзейнасці здабыў шмат актыву.

Намеснік старшыні гарадскога аддзела БГКТ у Беластоку Уладзімір Паўлоўскі і сакратар варшаўскага аддзела Віктар Швед паінфармавалі аб формах працы сваіх аддзелаў, у якіх асноўным актывам з'яўляецца моладзь. Аб пашане да актыву, аб заахвочванні яго да працы і аб магчымасцях стварэння гмінных праўленняў БГКТ гаварыў сакратар ГП Янка Зенюк.

Валя Філіпюк, кіраўнік культурна-асветнага аддзела ГП прысвяціла сваё выступленне павышэнню якасці конкурсаў на беларускую песню і на беларускае сцэнічнае слова і павелічэнню ліку яго ўдзельнікаў.

Важнай галіной працы БГКТ з'яўляецца збіранне і публікаванне беларускага фальклору Беласточчыны. Гэтыя справы акцэнтаваў Мікалай Гайдук — старшыня гарадскога аддзела БГКТ у Беластоку. Член Галоўнай рэвізійнай камісіі ГП Уладзімір Навіцкі выступіў з прапановай выдання брашуры аб працы БГКТ у сувязі з набліжаючымся 20-годдзем існавання БГКТ.

Старшыня бельскага аддзела Аляксей Карпюк падкрэсліў ролю беларускага ліцэя і яго значэнне ў працы БГКТ. Звярнуў ён таксама ўвагу на супрацоўніцтва аддзела з дырэктарамі і настаўнікамі пачатковых школ.

Член прэзідыума ГП Аляксандр Баршчэўскі выказаў думку адносна ўтварэння вялікай лектарскай групы, члены якой маглі б выступаць з дакладамі на такія тэмы, на якія ёсць запатрабаванне ў даным гуртку БГКТ.

ШКОЛА БУДУЧЫНІ

Два гады працаваў Камітэт экспертаў, якім кіраваў праф. др Ян Шчэпанскі, падрыхтоўваючы рапарт аб стане асветы. Нядаўна было аб'яўлена, што дакумент гатовы. Эксперты апрацавалі, між іншым, мадэль будучай сістэмы асветы ў Польшчы. Эксперты запрапанавалі чатыры варыянты, з тым, што большасць членаў камітэта выказалася за распаўсюджваннем сярэдняй адукацыі на ўзроўні 11-гадовай агульнаадукацыйнай школы.

Асновай, на якой раслі б вышэйшыя звенні асветнай сістэмы (пачатковае навучанне, сярэдняе і т.д.) было б прадшколле, якое дбала б пра аптымальнае развіццё дзіцяці і паступова падрыхтоўвала б яго да школьных абавязкаў.

Першы, т.зв. пачатковы перыяд навучання ў пачатковай школе будзе скарочаны на адзін год і ахопіць класы I—III.

У IV—VIII класах будзе абавязваць аднолітая праграма навучання, але рознай, дастасаванай да здольнасцей і зацікаўленняў вучняў была б праграма пазалекцыйных заняткаў. Тут павінна знайсціся месца як для вучняў здольных, так і менш здольных у навуцы, патрабуючых дапамогі. Пазалекцыйныя заняткі ў VIII класе павінны праводзіцца так, каб аблягчылі выбар спецыялізацыі ў старэйшых класах.

Для класаў IX—XI прапануюцца такія спецыялізацыі: матэматычна-фізічна-тэхнічная, хімічна-біялагічна-сельскагаспадарчая, грамадска-эканамічная і гуманістычна-культурная. Апошнія гады навучання ў агульнаадукацыйнай школе мелі б арыентацыйна-селекцыйны характар. Пастаяннае назіранне за вучнем, за яго здольнасцямі і зацікаўленнямі аблягчылі б даць адказ на пытанне: што далей, пасля заканчэння адзінаццацігодкі?

Якія магчымасці далейшай вучобы мелі б выпускнікі адзінаццацігодкі?

Могуць яны ісці на работу і там закончыць прафесіянальныя курсы. Могуць таксама вучыцца ў прафесіянальных школах, дзе навука будзе працягвацца (у залежнасці ад патрэб) ад 6 месяцаў да паўтара года. Падрыхтоўка сярэдніх тэхнічных кадраў, як прадбачваюць эксперты, павінна ісці ў вышэйшых прафесіянальных школах. Кожны выпускнік адзінаццацігодкі будзе мець права паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову. Аб тым, ці будзе ён прыняты на «студыя», будзе вырашаць не толькі ўдасканалены ўступны экзамен, але і вынікі, дасягнутыя на розных алімпіядах і ў гуртках зацікаўленняў, сярэднія ацэнкі з кірунковых прадметаў у IX—XI класах і здольнасці вучня.

Для вучняў, якія па розных прычынах не змогуць закончыць поўнай агульнаадукацыйнай школы, прадбачваецца адпаведна разбудаваная колькасць прафесіянальных школ і курсаў, а таксама спецыяльныя школы.


Апрача таго, запрапанаваны тры іншыя мадэлі школы. Першая прадбачвае распаўсюджванне сярэдняй адукацыі ў рамках існуючай сістэмы школьніцтва, з тым, што ўведзены былі б пэўныя змены, удасканальваючыя працу школы. Згодна з другой прапановай, 50 прац. моладзі вучылася б у агульнаадукацыйных ліцэях, 25 прац. — у асноўных прафесіянальных школах (ЗШЗ) і 5 прац. — у школах спецыяльных. Запрапанаваны яшчэ іншы варыянт гэтай прапановы: 10-гадовая агульнаадукацыйная школа і 2-гадовы прафесіянальны ліцэй. Трэці варыянт прадбачвае распаўсюджванне сярэдняй адукацыі на ўзроўні 10-годкі. Апошнія два гады навукі мелі б некалькі напрамкаў, што давала б аднačасова падрыхтоўку да прафесіянальнай працы.

Распачалася грамадская дыскусія як над мадэлямі адукацыі, так і над удасканальваннем працы школы. У кастрычніку, у 200 гадавіну стварэння Камісіі нацыянальнай адукацыі будзе ададзены пад разгляд Сеймам праект закона аб далейшым развіцці асветы.

А. К.

Ф·А·Л·Ь·К·Л·О·Р

ЛЮБОЎНАЯ



Ой, за лугам зелёненькім,
Ой, за лугам зелёненькім
Брала ўдава лён дробненькі.
Брала ўдава лён дробненькі.
Ана брала, выбірала,
Ана брала, выбірала,
Тонкі голас падавала.
Тонкі голас падавала.
Там Васілько сено косіў,
Там Васілько сено косіў —
Тонкі голас перэносіў.
Тонкі голас перэносіў.
Кінуў косу на далоньку,
Кінуў косу на далоньку,
А сам пашоў дадомоньку.
А сам пашоў дадомоньку.
Вышла маці із комнаты,

Вышла маці із комнаты,
Стала Васілька пытаці.
Стала Васілька пытаці.
— Што ж ты, Вася, ніц ні робіш
І нічого ні гаворыш?
І нічого ні гаворыш.
— Пазволь, маці, удаву браці
Та й я буду піць-гуляці.
Та й я буду піць-гуляці.
— Ні пазволю ўдавы браці!
Ні пазволю ўдавы браці —
Удава ўмее чараваці.
Удава ўмее чараваці.
— А я чараў ні баюся.
А я чараў ні баюся —
Дык на ўдове ажанюся.
Дык на ўдове ажанюся.

Ад Зоф'і Марцінчык, 1921 года нараджэння, вёска Меляшкі, Беластоцкага павету, запісаў 24 студзеня 1973 года Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі нотны запіс зрабіў Эдуард Гойлік.

(Працяг са стар. 1)

Рэнесанс тэатральнай дзейнасці

тыў з Меляшкоў атрымаў спецыяльную ўзнагароду за ініцыятыву і распаўсюджванне фальклорнай творчасці. Гарадоцкі калектыў атрымаў спецыяльную ўзнагароду за творчыя пошукі, а драмгурток з Сакоў вырушненне. За найлепшую індывідуальную ролю ўзнагароду атрымала Валя Мароз з Паўлаў Р. Місеюк, В. Мароз і З. Літвін атрымалі грашовыя ўзнагароды за добрае кіраванне тэатральнымі калектывамі.

Суарганізатарамі сёлетняга агляду і фундатарамі ўзнагарод былі ГП БГКТ, аддзел культуры Прэзідыума ВРН, рэдакцыя «Нівы», Ваяводскае прадпрыемства «Кніжка, Прэса, Рух», ВЗГС і ЗСМВ.

А. Карпюк
Фота аўтара

У дыскусіі выступілі таксама запрошаныя госці. Алег Туровіч, кіраўнік клуба ТППР у Беластоку, прапанаваў, каб мастацкія калектывы БГКТ выступалі ў памяшканні ТППР, каб выстаўкі БГКТ дэманстраваліся ў іх памяшканнях і каб супольна арганізаваць беларускі народны музычны калектыў.

Сакратар Акруговага праўлення пажарных каманд Ежы Лупінскі падкрэсліў, што пачатае супрацоўніцтва з Беларускім таварыствам неабходна пашыраць і супольна мабілізаваць людзей у вёсках на грамадскія чыны пры пабудове раміз і святліц.

Апошнім на пленуме выступіў прадстаўнік Ваяводскага камітэта ПАРП Аляксандр Сеўка. «Даклад і дыскусія, — сказаў ён, — паказалі дасягненні БГКТ і далейшыя напрамкі працы. Дзейнасць БГКТ даволі адчувальная і ў горадзе Беластоку, і на вёсках — і ў гэтым заслуга актыву БГКТ». Падтрымаў ён думку аб утварэнні лектарскай групы БГКТ і прапанаваў весці цяснейшае супрацоўніцтва з ТППР-ам.

II пленум закончыў працу прыняццем пастановы адносна таго, каб даклад, пашыраны дыскусіяй, быў дырэктывай для далейшай працы ўсіх звенняў БГКТ.

Міхась Хмялеўскі

ЛЮДЗІ ДОБРАЙ РАБОТЫ

Мікалай Мазурчук

Мікалай Мазурчук ужо 16 гадоў працуе на пошце ў Багданках Беластоцкага павету, у тым ліку ўжо дзесяты год з'яўляецца начальнікам гэтай установы. Гэта адзін з найлепшых паштовых работнікаў, энергічны і добры арганізатар працы. Пошта ў Багданках абслугоўвае 10 вёсак. Працуюць тут два пісьманосцы. Адзін з іх, Пётр Трахімчук з'яўляецца добрым прапагандыстам нашага тыднёвіка. У раёне яго абслугоўвання «Ніву» найбольш чытаюць у Чараўках і Заёнчках.

Сам начальнік пошты здаўна чытае «Ніву» і ахвотна раіць зрабіць на яе падпіску наведвальнікам пошты. Аднойчы зайшоў я на пошту за паштовымі маркамі, начальнік Мікалай Мазурчук, выдаючы рэшту, ветліва запрапанаваў мне зрабіць падпіску на беларускі тыднёвік. Маўляў, не дарагі ён, а пачытаць ёсць што: цікавыя артыкулы, рэпартажы і інфармацыі перш за ўсё аб людзях з беластоцкай вёскі, на сельскагаспадарчыя тэмы, аб моладзі, спорце, аб СССР, цікавыя аповесці і добры гумар. — Мы з жонкай заўсёды чытаем «Ніву», — заявіў ён. «Нівы» на пошце ў Багданках я не выпісаў, але такая рэклама газеты, у якой працую, мяне сардэчна абрадавала. Мы разгаварыліся. Аказваецца, пошта ў Багданках перадавая ў павеце. Начальнік з'яўляецца партыйным і грамадскім дзеячом у Багданках і ў Злотніках, у якой жыве разам са сваёю сям'ёю.

Начальнік Мікалай Мазурчук, як мне сказалі жыхары Багданак, гэта добры прапагандыст прэсы на вёсцы, у тым ліку таксама прэсы партыйнай. Працы ў яго нямала, але ўжо ў 1974 годзе будзе пабудавана тут аўтаматычная тэлефонная цэнтраля, якая значна аблегчыць працу на пошце.

Тэкст і фота (ця)



ЧЫТАЛЬНІЦКІ КОНКУРС, ПРЫСВЕЧАНЫ 200-АЙ ГАДАВІНЕ КАМІСІІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

Арганізатарам яго з'яўляецца Ваяводская педагагічная бібліятэка ў Беластоку пад патранатам куратарыі Беластоцкай школьнай акругі.

У конкурсе могуць прыняць удзел настаўнікі розных тыпаў школ і студэнты настаўніцкіх школ.

Адбудуцца павятовыя элімінацыі конкурсу (у кастрычніку 1973), а потым ваяводскія (у снежні 1973).

Да конкурсу трэба здабыць веды па акрэсленай праблематыцы, звязанай з Камісіяй нацыянальнай адукацыі, яе ўзнікненнем і роляй. Праблемы такія можна знайсці ў пададзенай у рэгуляміне літаратуры.

Першай узнагародай будзе ўзнагарода куратара Беластоцкай акругі — 2-месячная зарплата. (вл)

НАЙ... НАЙ...

...найдаўжэйшай вёскай у Польшчы з'яўляецца Завоя, якая знаходзіцца непадалёку ад Баб'яй Гары. Яе даўжыня 10 кіламетраў. Налічвае яна сем тысяч жыхароў.

...найбольшым спартыўным стадыёнам свету з'яўляецца Маракана ў сталіцы Бразіліі, Рыо-дэ-Жанейра. Ён можа змясціць 200 тысяч гледачоў.

...найвышэйшым будынкам свету з'яўляецца 102-этажны гмах у Нью-Йорку, пабудаваны ў 1931 годзе. Яго вышыня 380 метраў, а разам з тэлевізійнай вежай 449 метраў. Пасяліцца ў ім магло б на жыхарства 80 тысяч людзей. З даху гэтага будынка можна ўбачыць мясцовасці, якія знаходзяцца ў радыусе 64 кіламетраў. (ця)

БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул. Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Беларусь, 1972, цана 20 зл. 60 гр.

Фотаальбом, прысвечаны розным галінам жыцця сучаснай Савецкай Беларусі. Чорна-белыя і каляровыя фатаграмы, выкананы на высокім мастацкім і тэхнічным узроўні.

Узняты з руін, 1968, цана 30 зл. 40 гр.

Фотаальбом, прысвечаны сталіцы Беларускай ССР — старажытнаму і аднačасова маладому Мінску. Аўтарам тэксту і складальнікам альбому з'яўляецца вядомы сучасны беларускі паэт Анатоль Вялюгін. Каляровыя фатаграмы вызначаюцца высокай мастацкай і тэхнічнай якасцю. Паказваюць яны развіццё і прыгажосць звышмільённага горада.

Гісторыя Мінска, 1967, стар. 688, цана 42 зл. 40 гр.


Манаграфія, падрыхтаваная Інстытутам гісторыі Акадэміі навук БССР, расказвае пра дзевяцісотгадовую гісторыю Мінска (першае летапіснае ўпамінанне аб ім адносіцца да 1067 года), пра развіццё, жыццё насельніцтва, змаганнях беднага гарадскога люду за свае правы пры феадалізме і капіталізме, сучасных дасягненнях беларускай сталіцы. Выданне складаецца з прац шэрагу аўтараў пад рэдакцыяй Н. В. Каменскай, І. С. Краўчанкі, З. Ю. Капыскага і В. Ф. Рама초ўскага. Манаграфія багата ілюстравана.

Кнігарня імпартных выданняў у Беластоку ахвотна высылае кнігі за паштовым заліччэннем з далучэннем рахункаў. Запатрабаванні кіруйце па адрасу: „Dom Książki", Białystok, ul. Kilińskiego 10.

(мг)

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА

ЭКЗАМЕН ТРЫМАЮЦЬ МАШЫНЫ



Выпрабоўваецца балотны трактар «Т-130Б».

Размешчаны непадалёку ад Мінска пасёлак Прывольны добра вядомы спецыялістам сельскагаспадарчага машынабудавання Савецкага Саюза і краін Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. Тут размешчана Заходняя дзяржаўная занальная машынна-выпрабавальная станцыя (Заходняя МВС), створаная ў 1948 годзе. Яна з'яўляецца адной з шматлікіх падобных станцый, размешчаных на тэрыторыі СССР у розных кліматычных і глебавых зонах, і адзінай у Беларусі.

На Заходняй МВС вядзецца ўсебаковая праверка сельскагаспадарчых машын новых канструкцый.

Для выпрабаванняў сюды паступае прадукцыя розных заводаў Савецкага Саюза, краін сацыялістычнай садружнасці, а нярэдка і капіталістычных дзяржаў. Але ўся гэтая тэхніка па задумах яе стваральнікаў прызначана для работы ў зоне ўмеранага клімату на глебах, сходных з беларускімі. На станцыі штогод праходзяць выпрабаванні 90 - 120 машын і механізмаў. Тэрмін праверкі ўстаноўлены не аднолькавы. Напрыклад, трактар павінен прапрацаваць не менш 3 тысяч мота-гадзін, плугам трэба ўспахаць 100 гектараў зямлі, з дапамогай саджалкі правесці пасадку на плошчы 80 гектараў. Выпрабоўваемая тэхніка, як правіла, працуе ў натуральных умовах, у гаспадарках Мінскага і суседняга Пухавіцкага раёнаў. А супрацоўнікі спецыялізаваных лабараторый і аддзелаў МВС праводзяць усемагчымыя кантрольныя вымярэнні, супастаўляюць умовы працы механізатара з патрабаваннямі тэхнікі бяспекі, правяраюць эксплуатацыйную надзейнасць машын, эканамічную эфектыўнасць і вытворчасць працы на іх, акрэсліваюць перавагу новай машыны ў параўнанні з тымі, што знаходзяцца ў вытворчасці.

Павышэнне дапушчальнага ўзроўню шуму, канцэнтрацыя шкодных рэчываў ці іншых неспрыяльна дзейнічаючых на арганізм чалавека фактараў вядзе за сабой абавязковыя канструктарскія змены.

Прадстаўнікі заводаў, якія вырабляюць машыны — частыя і жаданыя госці на МВС. Асабліва цесныя сувязі з выпрабавальнікамі пасёлка Прывольны падтрымліваюць мінскія трактарабудаўнікі, работнікі Лідскага і Гомельскага заводаў сельскагаспадарчага машынабудавання. На станцыі працуюць шматлікія лабараторыі. Вынікі лабараторных праверак, дадзеныя, атрыманыя ў полі ці на фермах, апрацоўваюцца на вылічальных машынах непасрэдна на станцыі. Вывады спецыялістаў заносяцца ў афіцыяльны пратакол дзяржаўных выпрабаванняў.


Канчатковае рашэнне прымае навукова-тэхнічны савет у Маскве, які складаецца з вядучых спецыялістаў сельскагаспадарчага машынабудавання, вучоных, прадстаўнікоў міністэрства на аснове матэрыялаў, паступаючых ад заводаў, якія вырабляюць машыны і выпрабавальнікаў, адну і тую ж машыну адначасова правяраюць у розных умовах, на розных станцыях. Беларускія выпрабавальнікі ганарацца тым, што іх вывады, як правіла, не выклікаюць засцярог у членаў навукова-тэхнічнага савета, а рэкамендацыі прымаюцца да абавязковага выканання.

Тэкст і фота Э. Трыгубовіча



Аператар перадзвіжной інфармацыйнай вымяральнай лабараторыі Вольга Несцярок за работай.

Урач-гігіеніст Люба Залатоўская і старшы інжынер лабараторыі Канстанцін Бычкоў праводзяць памеры шуму ў кабіне трактара.



У вылічальным цэнтры машынна-выпрабавальнай станцыі.



ЯК ЗВАРЫШ, ТАК І З'ЯСІ

ВІТАМІНЫ РАННЯЙ ВЯСНОЮ

САЛАТ З ЧОРНАЙ РАДЫСКІ

На адну радыску трэба ўзяць адно яблыка, невялікую морквіну, соль, цукар, смятану.

Абабраную, памытую радыску сцерці на дробнай тарцы, моркву на тарцы для салатаў, а яблыка на бурачанай тарцы. Да сцертых прадуктаў дадаць соль і цукар па смаку, вымяшаць са смятанай.

САЛАТ З СЕЛЕРА

На палову сярэдняй велічыні селера ўзяць адно яблыка, лімонную кіслату, соль, цукар, дзве лыжкі алею.

Абабраны і памыты селер сцерці на дробнай тарцы, спырснуць распушчанай у лыжцы лімоннай кіслатой. Дадаць сцерты на булачнай тарцы яблык, заправіць цукрам і соллю па смаку, вымяшаць з алеем.

САЛАТ З ПОРАЎ

На дзве вялікія поры ўзяць адзін кіслы агурок, адзін яблык, соль, цукар, дзве-тры лыжкі алею.

Паабразаць цёмназялёныя лісткі пораў, абрэзаць цвёрдую пятку разам з карэньчыкамі. Нарэзаць поры ўпоперак у тонкія кружкі, пасыпаць лыжачкай цукру, пасаліць і пакінуць на дваццаць мінут. Дадаць сцерты на бурачанай тарцы яблык, кіслы агурок, вымяшаць салат з алеем.

САЛАТ З ПОРАЎ З МАЯНЕЗАМ

На тры поры ўзяць два яблыкі, дзве-тры лыжкі маянезу. Соль і цукар дадаем па смаку.

Поры дакладна памыць, паабразаць цёмназялёную частку і пятку з карэннямі, нарэзаць упоперак. Палажыць поры на друшлак, апусціць у кіпячую ваду на дзве-тры мінуты. Адцэджаныя поры астудзіць, дадаць соль, цукар, сцертыя на бурачанай тарцы яблыкі, маянез, усё вымяшаць. Падаваць з крутымі яечкамі і хлебам. Дасканалае блюда на вячэру.

ЦЫБУЛЯ, ТУШАНАЯ З ГРУДЗІНКАЙ

На 30 дэкаў цыбулі ўзяць 15 дэкаў грудзінкі, адно яблыка або паўшклянкі памідорнага соку, соль, перац.

Бочак дробна нарэзаць, крыху падсмажыць, зняць з патэльні скваркі. На гарачы тлушч палажыць нарэзаную цыбулю, падсмажыць яе. Калі памякчэе, дадаць яблыка, сцертае на тарцы, разам падтушыць. Падаваць гэтае блюда разам са скваркамі з грудзінкі і есці з хлебам.

Гаспадыня

Ці ведаеце, што...

...5 337 студэнтаў вучыцца ў трох беластоцкіх установах вышэйшай адукацыі: Медыцынскай акадэміі, Вышэйшай інжынерскай школе і філіяле Варшаўскага універсітэта. У мінулым годзе вучобу ў іх паспяхова закончыла 976 асоб.

...158 000 радыёпрыёмнікаў і 133 000 тэлевізараў карыстаюцца жыхары гарадоў і вёсак Беласточчыны. Больш іх маюць аднак жыхары гарадоў. (ця)



За ноч яны не вельмі далёка прасунуліся. Рэчка затрымала іх больш чым на гадзіну. Вайтхазе і Франке доўга шукалі броду, запэцкаліся ў ціне, прамоклі і змерзлі. Хацелі ўжо спыніць пошукі, як раптам знайшлі пераправу. Ноч была халаднейшая, чым папярэднія. Развіднела на паўгадзіны пазней, чым тады, калі яны прыляцелі ў гэтыя лясы. Зразумелі — лета канчалася. У іх было толькі адно жаданне — даць адпачынак целу, асабліва нагам. Усе выбіліся з сіл. Цэлы дзень яны адлежваліся ў лесе і толькі наступнай ноччу зноў пайшлі далей. Хоць ношы сталі лягчэйшыя, але яны з яшчэ большай сілай прыціскалі іх да зямлі. «Чаму б нам на адзін-два тыдні не разбіць сапраўдны лагер, каб прывесці сябе ў парадак, сабрацца з сіламі, — разважаў Будэр. — А то мы толькі два-тры дні сядзім на адным месцы, а потым зноў начамі блукаем па лясах». Будэр падзяліўся сваімі думкамі з Вайтхазе. Асабліва добра было б, сказаў ён, размясціць рацыю ў штабе Грэльхамера. Вайтхазе растлумачыў яму, што падпалкоўнік не хоча, каб рускія выявілі, дзе знаходзіцца яго штаб-кватэра, што ён знарок уводзіць у зман савецкіх радыёпеленгатараў, гуляе з імі ў кошкі і мышкі.

Ноччу яны праходзілі паўз нейкую вёску. Праз вокны некаторых дамоў лілося яркае святло, быццам навокал панаваў мір, а на адным сялянскім двары гула, асветленая пражэктарам, малатарня. Усе чацвёра спыніліся і пачалі ўслухоўвацца ў мерны строкат, які іншы раз пераходзіў у надрыўнае гудзенне, калі ў пашчу машыны пападала занадта многа каласоў.

Наступны прывал зрабілі ў густым ельніку на невысокім грудку пасярод балота. Скінулі свае ношы і цяжка апусціліся на дол. Не хапіла сіл сцягнуць з ног боты і падкласці пад галаў скруткі шынялёў. Умомант заснулі, не выставіўшы нават вартавога. Іх акрапіла раса восеньскай раніцы, і мундзіры зрабіліся мокрыя. Толькі пад вечар адзін за адным прачнуліся. Апошнім расплюшчыў вочы Будэр. Яму сніўся пляж, белы пясок, рознакаляровыя шэзлонгі, дзеці, што гулялі з мячом, і бялявая жанчына, якая падкідала высока ў неба гумавае кольца. Убачыўшы раптам яловае голле і адчуўшы рэзкі пах трухлявага дрэва і балотнай вады, ён паспрабаваў зноў убачыць пляж, сонца і жанчыну з бялявымі валасамі, але позірк яго ўпаў на Франке, на шэрым твары якога неахайна тырчэла шчаціннe, а з-пад шапкі, што збілася яму на патыліцу, вытыркаліся ўскудлачаныя пасмы валасоў. Франке трымаў у руцэ адкрытую кансервавую бляшку, перакуліў яе дном угору і намагаўся вылізаць языком апошнія кавалкі мяса, стараючыся не парэзацца. Змрочная рэальнасць з магутнай сілай прыціснула Будэра да зямлі, ён лёг, зноў заплюшчыў вочы, марна заклікаючы назад свой прыгожы, прыемны сон.

Раптам пачуў голас Франке:

— Праклятыя мурашкі! Кусаюцца, бы тыя д'яблы!

Будэр прыціснуў твар да рукава. Спадзяваўся, што ніхто не заўважыць, як ён пакутуе, і душэўны боль яго пройдзе. Ён ляжаў яшчэ вельмі доўга, і калі яму, нарэшце, удалося зноў авалодаць сабой, яго ахапіў страх, што ён можа звар'яцець. Апошнія гады яго пасылалі на адно заданне за другім, і кароткія перадышкі былі недастатковыя, каб даць адпачыць яго нервам.

— Вы можаце ўсё гэта вытрымаць? — шэптам запытаў ён. — Лясы без канца і краю. Вечны шэпт. Самі ў брудзе з галавы да ног...

Вайтхазе спагадліва глянуў на яго.

— Ваша праўда, — прамовіў ён. — Ад нас патрабуецца занадта многа. Але Германія ў небяспецы. Мы павінны прынесці сябе ў ахвяру — вы, Франке і я, інакш нельга.

— Хіба мы не можам, прынамсі хоць на некалькі дзён пабыць на адным месцы і крыху адпачыць?

— Пабачым..., — адказаў Вайтхазе. — Пагавару з Грэльхамерам.

Вечарам Вайтхазе пусціўся ў свой звычайны шлях. Але звесткі, якія ён прынёс наступнай ноччу, былі бязрадасныя.

Праз паўгадзіны Будэр ужо радзіраваў: «Паўднёвы фронт катла адціснуты

ТРЫБУНА чытачоў

СТАРАЕМСЯ І ЛІЧЫМ НА ДАПАМОГУ

Жыхары нашай вёскі не спяць, а ўсё больш думаюць пра новае. Нядаўна ўсёй грамадой, маладыя і старыя, будавалі святліцу, цяпер узялі напрамак на пабудову пункта аховы здароўя. Камітэт будовы яго, які ўзначальвае Мікалай Аверчук с. Антяха, узяўся ўжо за работу. Новая будова будзе каштаваць мільён сто тысяч злотых. Камітэт будовы лічыць не толькі на жыхароў сваёй вёскі, але і на іншых. Дэкларацыі падпісалі, апрача Дубяжына, Кошкі, Райкі, Мокрэ, Алекшы. Прымем і іншыя вёскі, якія захочуць належаць да нашага пункта аховы здароўя. Лічым таксама і на дапамогу мясцовых улад, якія дагэтуль слаба цікавіліся нашай вёскай. А павінны яны зацікавіцца ёю больш, бо яна актыўная: і ў грамадскіх чынах, і ў іншых карысных мерапрыемствах.

Аляксандр Раманюк, Дубяжына



НАША ВЁСКА

Вёска наша невялічка,
Хаткі тут зусім малыя,
Людзі тут жа, як асілкі
— Беларускія сыны.

Кажуць, ў даўнія часіны,
Дзе цяпер ўжо лес парос,
Былі мокрыя мясціны,
Разлажыўся тут абоз.

Сталі людзі хаты ставіць,
Лес рубаць, зямлю араць.
— Добра вёску тут паставіць,
Гаспадарку развіваць.

Жылі год ужо мо дваццаць,
Добра зналісь, разжылісь,
Хат ўжо болей, як пятнаццаць,
Нават птушкі развялісь.

Усё лепш і лепш жылося,
Песні сталі тут спяваць,
Вёску ў лесе ля балота,
Саломінам сталі зваць.

Ды нядоўга гэта радасць
На вуснах у іх была,
Бо няшчасце прывязалась —
Вёска спалена была.

Людзі зноў жа за работу,
Брацца сталі — лес рубаць,
Вёску нову ля балота
Пачыналі будаваць.

Ды другая гэта вёска
Стала хутка так расці.
Нешта з боку, ля бярозкі,
Якіх можа дзве вярсты.

Калі ўсё было гатова,
Людзі зноў сталі спяваць,
Вёску гэту ля балота
Ўжо Спічкамі сталі зваць.

Асеннік Васіль,
Бельскі беларускі ліцэй.

назад, адрэзана група прыблізна з двухсот чалавек і ў жорсткім баі знішчана. Кавалер рыцарскага крыжа, лейтэнант Пагель загінуў. Вярнулі назад сваю пазіцыі на восем кіламетраў на поўнач. Месца скідвання ранейшае. Дэкуем за грузы, скінутыя за апошнія ночы. Пры прызямленні ўрач зламаў сабе нагу. Просім яшчэ аднаго. Патрэбны кулямёты, аўтаматы з боепрыпасамі, пісталеты, ручныя гранаты, кішэнныя ліхтарыкі з батарэйкамі. Частка правізіі трапіла ў рукі ворага. Узмацніце прысылку прадуктаў харчавання і алкагольных напіткаў».

«Справы дрэнь, — разважаў Будэр. — Нешта з самага пачатку мне гаварыла, што так будзе. Іх там цяпер яшчэ тысяча, хутка застанецца восемсот, потым пяцьсот, а там — дзвесце. Немецкі салдат змагаецца да апошняга дыхання. І гэтак ад самага Сталінграда, і не відаць ні канца, ні краю».

— Паслухайце, — сказаў Вайтхазе, — становішча на самай справе не такое сур'ёзнае, як здаецца. Варожы клін ізаляваны. Саветы спрабавалі прарваціца туды танкамі, але вялікага поспеху не дабіліся. Нашы падбілі тры машыны. Пра гэта мы радзіруем заўтра ноччу, таму што сённяшняя наша радыёграма і так была занадта доўгая.

(Працяг будзе)

Грамадскія чыны паштавікоў

Добра разгортваецца спаборніцтва працы ў першым акруговым паштовасувязным упраўленні ў Беластоку. Усе паштовыя ўстановы ўключыліся ў спаборніцтва на першынство ў 1973 годзе, а пісьманосцы — на найлепшага пісьманосца. У Гарадку, Ялоўцы, Юшкавым Грудзе і Міхалове ўсе калектывы паштавікоў абавязаліся ўключыцца ў спаборніцтва.

Прыняты таксама абавязацельствы ў гонар 1 Мая. Пошта ў Міхалове прыняла абавязацельства адпрацаваць 40 гадзін пасля працы пры парадкаванні панадворка пошты і 130 гадзін на карысць гміны. Вартасць гэтага грамадскага чыну складзе 6760 злотых. У Ялоўцы вырашана абгарадзіць драцянай сеткай панадворак пошты, пасадзіць навокал яго 20 карчоў чорных парэчак, а таксама адпрацаваць 40 гадзін на карысць пасёлка. Агульная вартасць грамадскага чыну 2300 злотых. Пошта ў Юшкавым Грудзе адпрацуе 125 гадзін пры парадкаванні прысядзібнай плошчы і на карысць вёскі. Вартасць чыну — 1300 злотых. Паштавікі Гарадка таксама будуць парадкаваць сваю тэрыторыю і працаваць на карысць гміны. Аляксей Лукша абавязаўся адпрацаваць 14 гадзін, Лідзія Карчэўская і Ян Гогель па 4 гадзіны. Падобныя абавязацельствы прынялі таксама Генадзь Грыцук і Сяргей Яроцкі.

М. Гогель



Дарагое «Сэрцайка»!

Мне споўнілася 14 год. Жыву я на вёсцы. Вучуся ў сёмым класе пачатковай школы. Маю хлопца. Завецца ён Янэк і вучыцца ў восьмым класе. Спатыкаемся мы ўжо два гады. У школе на перапынках гуляем і гутарым. У нядзелю ён прыязджае да мяне. З вечарынак праводзіць мяне дадому, гутарым да позніх гадзін. Я вельмі яго люблю. Ён гаварыў таксама, што без мяне не можа жыць. Не ведаю, ці гэта праўда. Усё было б добра, калі б не канец школьнага года. Я баюся, што калі ён пойдзе вучыцца ў Беласток, бо гаварыў, што пойдзе вучыцца далей, то напэўна забудзе мяне, знойдзе сабе іншую. Таму, «Сэрцайка», я хацела б нейк добра з ім расстацца. Хачу, каб ён мяне надоўга запомніў. Не ведаю, ці потым пісьмы да яго пісаць, ці не?

За параду буду табе вельмі ўдзячна.

Ірэна з Беластоцкага павету.

Ірэна! І ты, і твой хлапец яшчэ вельмі маладыя, каб гаварыць аб сапраўдным, трывалым каханні. Я веру, што вы адзін другому падабаецеся. Гэта ў дзяцінстве здараецца, але браць гэта так сур'ёзна, ды абапіраць на ім свае планы на будучыню нельга, бо акажуцца яны такія нетрывалыя, як нетрывалае бывае дзіцячае каханне. Мо яшчэ ў будучыні не адзін хлапец табе спадабаецца, а праменні дзіцячага кахання застануцца як успамін з дзіцячых гадоў. Хлапец твой канчае восьмы клас і пойдзе вучыцца далей. Гэта вельмі добра. Але аб сваіх планах ты не ўспамінаеш, а толькі пытаешся, як з ім расстацца, каб цябе надоўга запамятаў. Як вы расстанецеся, гэта не такое важнае і ў асноўным яно не будзе мець вялікага ўплыву на вашы далейшыя сувязі. Калі хочаш падабаца хлопцу, дык заканчыўшы восьмы клас, таксама ідзі вучыцца далей. Ды старайся вучыцца добра, старанна. Тады зможаш перапісвацца з хлопцам. У вас будуць супольныя цікавыя тэмы. І хто ведае, можа, калі вы ўжо будзеце ў старэйшых класах сярэдніх школ, або закончыце навуку, ваша сувязь стане трывалай, а ваша дзіцячае каханне будзе каханнем трывалым, каханнем дарослых людзей. А цяпер — за кніжкі, за навуку! Набліжаецца ж канец школьнага года, хай жа выпадзе ён для цябе як найбольш карысна, хай на тваім пасведчанні з сёмага класа красуюцца пяцёркі!

«Сэрцайка»

А нам не найгорш

Калоніі вялікай вёскі Навакорніна ў Гайнаўскім павеце называюцца «Грудоўка». Напэўна цяпер ніводнага чалавека, што жыве ў вёсцы, ніхто не выгнаў бы на бездарожжа, у поле, каб там ён будаваўся, стварыў сабе куток для жыцця. А нам так давялося. Дзе раней качкі плавалі, багнам заносіла, там цяпер мы жывем. «Грудоўка» цягнецца 3 кіламетры, і ўсе каланісты пасяліліся ўздоўж дарогі. Пачатак быў цяжкі. А цяпер, можна сказаць, адкрыўся нам новы свет. У 1968 годзе нашы землі былі здрэнаваны. Хоць зямля ў нас і так добрая, адразу павысіўся ўраджай.

1972 год быў для нас надта добры. Вясною атрымалі мы святло. Адразу адазваліся машыны, загаварылі радыёпрыёмнікі, зайгралі пласцінкі. Не мелі мы добрага выезду. Дарога, якая вяла ў вёску, была вельмі разбіта трактарамі. Пры дапамозе дарожнага майстра і машын сельгасгуртка ўсе нашы жыхары акапалі дарогу равамі, а верх пакрылі жвірам. У гэтым годзе таксама пастанавілі мы памагчы чынам пры пабудове новай дарогі, якая злучыць нас з Дубінамі. Гэта для нас важная справа, бо некаторыя з нас, апрача матацыклаў, маюць і легкавыя машыны.

Мікола Рынго, Навакорніна.

Грыгораўская святліца

Вёска Грыгораўцы (Бельскі павет) невялікая, аднак вялікія тут патрэбы ў культурным цэнтры. Сяляне гэта разумелі і ў 1971 годзе пабудавалі святліцу. На адкрыцці прадстаўнік тагачаснай ГРН горача запэўніваў, што ГРН разумее грамадскую працу сялян і таму ў бліжэйшы час у святліцы будзе абсталяваны клуб з тэлевізарам, прэсай і кніжкамі.

І што аказалася? Прайшло ўжо два гады, а святліца пустая. Праўда, ГРН дала адзін стары стол, месца якога ў Прэзідыуме заняло сучаснае бюрка. Далі таксама збітую з дошак лаўку. Гэтая мэбля цяпер служыць для гульні ў карты. Цікавейшай прапановы на свабодны час, на жаль, тут няма. Яшчэ святліца выкарыстоўваецца на патанцоўкі. А ці ж, сапраўды, нельга было б абсталяваць тут тэлевізар, даць сюды хоць некалькі столікаў і крэслаў? У многіх вёсках, дзе нават няма святліц, ёсць грамадскія тэлевізары. Яны стаяць у прыватных кватэрах. А тут?

Мо гміна ў Орлі зацікавілася б гэтай справай і прызначыла з свайго культурнага фонду на культуру ў Грыгораўцах. Усім вядома, што ГРН у Грыгораўцах (існавала да 1.І.1973 г.) мела на гэта грошы, якія некуды прапалі.

А можа гміна ў Орлі не можа давесці прылады ў грыгораўскую святліцу з увагі на дрэнную дарогу ў Малінніках (пісала аб гэтым «Ніва»)? Не бойцеся, можна аб'ехаць на Грэдалі. Крыху далей, але затое суха.

Прозвішча і адрас, вядомыя рэдакцыі.

НЕ АДНЫ БУЛАЧКІ...

У 12 нумары «Нівы» я прачытала інфармацыю Мікалая Корха з Чэхаў Арлянскіх аб маёй мясцовасці — Кляшчэлях («Да чаго дажыліся»). У нас, сапраўды, цяпер закрыта гаспода, бо ў рамонце. Аднак не веру, што «гаспадары лаюць кляшчэлеўскае кіраўніцтва за тое, што няма дзе нават купіць сухой булачкі...» Хто хоча купіць, той купіць. У нас у магазінах ёсць не толькі булачкі і рыбныя кансервы, але стаіць на полках многа мясных кансерваў.

Глянем на гэту справу з іншага боку. Цяпер у нас цэлыя дрэўцы і платы, бо гаспадары вяртаюцца з торгу дамоў цвярозыя. А працаўнікоў ГС і ПОМ кіеўскі з булкамі і падагрэтай кілбасой не выратуюць. Цікава, хто б там купляў гэта? На закуску можа і купілі б.

У нас ёсць больш балючая справа. Ужо звыш месяца закрыты кіёск з газетамі. І хто не ездзіць у Бельск або Гайнаўку, той застаецца без газет. Тут сапраўды мы дажыліся. У нас таксама звыш трох месяцаў закрыты клуб (там таксама рамонт). Цяпер моладзь не мае куды дзецца вечарамі.

Аліна Ярашэвіч



Яўгень Семянюк, Бельск. У «Белавежу» яшчэ рана.

Міра Лукша, Баравыя. Вершы дасканалыя, надрукуем.

«Чытач «Нівы» з вёскі Пашкоўшчына». Справай, якую вы апісалі, мы зацікавілі павятовыя ўлады. Напішыце, як яна вырашана.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Szczęście Anny" (rum.) 17—18, „Niezawodni przyjaciele" (rumuński), 19—20, „Znicz olimpijski" (polski) 21—22.

Нараўка
„Trzecia część nocy" (polski), „Kochany drapieżnik" (radz.) 18—22.

Нарва
„Dzikie dziecko" (franc.), „Dawid Copperfield" (angielski) 18—22.

Чыжы
„Agnieszka 46" (polski), „Don Gabriel" (polski) 18—22.

Дубічы Царкоўныя
„Trup w każdej szafie" (czeski), „Bajka o Mrozie Czarodzieju" (radz.) 18—22.

Арэшкава
„Przez pustynię" (meks.), „Szerokiej drogi kochanie" (polski) 18—22.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Polonez Ogińskiego" (radz.), „Ucieczka w milczenie" (NRD), 18—22.

Орля
„Zaraza" (polski), „Żandarm z gór" (bułgarski), 18—22.

Райск
„Ballada o Cable u' Hugeue'u" (USA), „Zdobywcy nieba" (radz.), 18—22.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Шудзялава
„Kopernik" I i II cz. (polski) „Zabijcie czarną owcę" (polski), 18—22.

Янаў
„Lampy naftowe" (czeski) 18—22.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Kajtek i nowy braciszek" (węgierski), 17—18, „Niech bestia zdycha" ,franc.), 19—20, „Początek nowego świata" (rum.) 21—22.

Мельнік
„Daleka jest droga" (polski), 17—18, „Raj na ziemi" (polski), 19—20, „Album polski" (polski), 21—22.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

Сухаволя
„Jarzębina czerwona" (polski), „Raj na ziemi" (polski) 18—22.

Новы Двор
„Polonez Ogińskiego" (radz.), „Poszukiwanie" (hiszp.), 18—22.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Wydawca: Białostockie Wydawnictwo Prasowe RSW „Prasa-Książka-Ruch". Redaguje Kolegium. Adres Redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Numer przy przesyłkach pocztowych: Redakcja tygodnika „Niwa", Skr. poczt. 281, 15-950 Białystok. Telefony: Redaktor Naczelny i Sekretarz Redakcji 2-10-33, publicyści 2-32-41 do 45 (centrala). Cena prenumeraty krajowej: rocznie: 28,80 zł., półrocznie: 14,40 zł, kwartalnie: 7,20 zł. Prenumeraty przyjmowane są do dnia 10 każdego miesiąca poprzedzającego okres prenumeraty. Prenumeraty na kraj dla czytelników indywidualnych przyjmują Urzędy Pocztowe oraz listonosze. Można również wpłaty na prenumeratę indywidualną dokonywać na konto I Oddziału Rejonowego „Ruch" w Białymstoku 150-6-161 NBP I OM Białystok. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Wszystkie instytucje państwowe i społeczne w miastach, zamawiają prenumeratę wyłącznie za pośrednictwem Oddziałów i Delegatur RSW „Prasa-Książka-Ruch". Pozostałe — mające siedzibę na wsi lub w innych miejscowościach, w których nie ma Oddziałów i Delegatur zamawiają prenumeratę za pośrednictwem Urzędów Pocztowych. Prenumeratę na zagranicę przyjmuje: RSW „Prasa-Książka-Ruch" Biuro Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych, Wronia 23, 00-840 Warszawa. Konto PKO Nr 1-6-100024. Cena prenumeraty dla zagranicy jest wyższa od prenumeraty krajowej o 40%.

BZGraf. Nakład 8 102 K-1

ДЛЯ ПАЧАТКУ — НІЧОГА

Дзень схіляўся да вечара. Пані Шаматкова мыла посуд. Дачка яе Олінка перагортвала ілюстраваны журнал. Потым яна ціха сказала:

— Мама!

— Што, дачушка?

— Хочаш, памагу талеркі выціраць?

— А потым папросіш грошай на новы світэр? — засмяялася маці.

— Не, мамачка, але... Я хачу табе сказаць сёе-тое па сакрэту...

Олінка пачырванела і апусціла вочы.

— Гавары смялей! Бацька спіць пасля абеду, не чуе! — падбадзёрыла пані Шаматкова.

— Мам, мне ўжо васемнаццаць...

— Ведаю, ну і што?

— Мам, у мяне хлопец ёсць... Хоча замуж узяць. Хутка Вялікдзень, гаворыць, тады і вяселле за адным захадам згуляем.

— Працуе?

— Працуе... Электраманцёрам...

— Без дыплома, значыць?

— Без дыплома, мамачка... Але ён вельмі добры.

— Што ж, Олінка, для пачатку нічога. Першы муж можа быць і без дыплома. Мой першы таксама не быў інжынерам. А ўжо потым я за твайго бацьку выйшла...

Мілан Кукучка
(Чэхаславакія)

— *Ты ўпэўнены, што на такіх нагах мы дойдзем да сацыялізму?*

НА ТВАІМ МЕСЦЫ

— У мяне страшэнна баліць зуб.

— Дружа! Калі б я быў на тваім месцы, дык пайшоў бы да дантыста і вырваў бы той зуб...

— Я таксама зрабіў бы, калі б быў на тваім месцы.

З ІМПАРТУ

Дырэктар фірмы выклікаў галоўнага бухгалтара і сказаў:

— У сувязі з рэарганізацыяй, праведзенай у нашай фірме, я запрасіў вас, дарагі містэр Джэксан, каб падзякаваць і сказаць «да пабачэння».

— Шкада! І калі ж вы нас пакідаеце?

ГУМАР З

ЛІСА І ЦЕЦЯРУК

Сядзеў цецярук на бярозе і спяваў **свае песні. Пачула** ліса і захацелася ёй цецеруком падсілкавацца. Падышла яна да дрэва і кажа:

— Слухай, цецярук, ці не чуў ты, што цяпер пайшлі новыя законы: каб усе звяры мірна жылі, адзін аднаго не чапалі. Нават загад ёсць, я яго сама чытала.

А цецярук ёй гаворыць:

— Добрыя законы, але, чую, недалёка сабакі брэшуць, вось-вось сюды прыбятуць.

Збіраецца ліса ўцякаць, а цецярук:

— Дык пачакай, можа яшчэ які закон прынясуць. Калі ж ёсць такі закон, каб адзін аднаго не чапаць, дык няма чаго баяцца.

Ліса гаворыць:

— А можа яны яшчэ загады тыя не чыталі. Трэба ўцякаць.

Так і не ўдалося ёй перахітрыць цецерука.

— *Вы сапраўды ўпэўнены, што прыйшла вясна?*

НІЎКА

МІНІВЕРШЫ

ТАКОЙ БЯДЫ

Як разлюбіш ты, нарэшце,
Буду вельмі бедаваць:
Уначы не буду есці
І ўвесь дзень не буду спаць.

Мікола Вяршынін.

КЛОПАТ ГУЛЬТАЯ

Клопат гультая такі:
— Не намуляць бы бакі...

Алесь Махнач.

Талабаломка

Фігура злева складаецца з сямі элементаў, якія можна поўнасцю ўлажыць на фігуру, змешчаную побач. Як гэта зрабіць?

НАХАБНІКІ

Зайшоў у аўтобус стары дзядуля. Сагнуўся ды і стаіць, бо месцы ўсе заняты. А адзін маладзік кажа другому:

— Ну і нахабнымі сталі гэтыя старыя!.. Так і тырчаць перад носам, каб хто ім месца ўступіў...

ПАСЛЯ ЗАРПЛАТЫ

Прыйшоў муж дамоў п'яненькі, а жонка і пытае:

— Ты атрымаў зарплату?

— Атрымаў.

— А дзе ж яна?

— Ды на апчаднай кніжцы.

— А дзе ж твая кніжка?

— Ды яшчэ друкуецца...

...Сумленне яму сёе-тое падказвала. Ды падказкамі ён не карыстаўся прынцыпова.

...Палез за словам у кішэню і дастаў кастэт.

ДЫХАЦЬ НЕ ХОЧАЦЦА!

— Пане старшыня, я магазін вартаваць больш не пайду! — заявіў у канторы дзед Гнат.

— А то чаму? — спытаў старшыня.

— Вы казалі, што работа лёгкая, а яно ж не... Так наробішся за ноч, што і дыхаць не хочацца. Толькі чуеш: «Гнацiку, ану падай!»

— А каму ж гэта вы падаеце?

— А хіба я ведаю. Яно ж **паночы, ды і падыходзіў я ззаду.**

Чаго ў спорце не бывае!

ПРАДБАЧЛІВАСЦЬ

Купіў Мікола ў горадзе таз. Прабіў у ім дзірку і панёс да майстра ладзіць.

— Навошта ж ты купіў таз з дзіркаю? — здзівіўся майстар.

— Ды не, я купіў цэлы, — адказаў Мікола, — але ж усё роўна ён каліся прадзіравіцца, а ў вёсцы ў нас майстра няма. Лепш я заадно ўжо і паладжу, пакуль у горадзе...

І ТО ДОБРА

У дзяўчыны запыталіся:

— Што ты добрае зрабіла для сваёй вёскі?

— Выйшла замуж за аграномa.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Ніны Самосюк і Галіны Анціпюк з Міхалова, Тамары Дарашкевіч з Меляшкоў Беластоцкага павету, Марыі Нічыпарук, Марысі Сэвесюк, Ольгі Ручай, Ніны Баравік і Марысі Лаеўскай з Мора, Аліка Янушкевіча з Рыбакоў і Янкі Пякарскага са Старога Ляўкова Гайнаўскага павету, а таксама Мікалая Гадзіны з Райска Бельскага павету змяшчаем папулярную сучасную ўкраінскую песню

CZERWONA RUTA

Muzyka i słowa ukraińskie: W. Iwasiuk
Słowa polskie: Janusz Laskowski

Wyznaj, wyznaj dziś mi
jakie czary rzuciłaś,
czemu smutne me dni,
czemu smutna ta miłość?
Ruty w lesie rósł kwiat,
wietrzyk szepnął ci: zerwij!
Ruty na mnie czar padł,
ruty zapach i czerwień.

Jak górski strumień,
pięknо nieść, kochać umiesz,
jesteś jak leśna ruta,
ruty czerwień, czar.

Nie szukaj, miła,
skarbów tych, któreś śniła,
urok twój — kolor ruty,
ruty czar.

Ciebie przyniósł mi sen,
przyniósł lasem zielonym.
Zwiewna, lekka jak cień,
idziesz ścieżką mych wspomnień.
Miłość w sercu na dnie
kryje słowa łaskawsze.
Widzę ciebie we śnie,
będziesz ze mną już zawsze.

*

Ти признайся мені,
Звідки в тебе ті чари.
Я без тебе всі дні
У полоні печалі.
Може, десь у лісах
Ти чар-зілля шукала,
Сонце-руту знайшла,
І мене зчарувала.

Червону руту
Не шукай вечорами.
Ти у мене едина,
Тільки ти, повір.
Бо твоя врода —
То е чистая вода,
То бистрая вода,
Синіх гір.

Бачу я тебе в снах
У дібровах зелених.
По забутих стежках
Ти приходиш до мене.
І не треба нести
Мені квітку надії,
Бо давно уже ти
Увійшла в мої мрії.

— *Спачатку штраф, а потым ужо балбатня аб міжпланетных кантактах...*

Курёзы

НА ЖЫЎЦА...

Для барацьбы са злачыннасцю і насіллем у Лос Анджэлесе (ЗША) гарадскія ўлады распрацавалі праект пад назвай «Вулічная вахта». Згодна з гэтым праектам, мяркуецца шырока выкарыстоўваць мужчын-паліцэйскіх, пераапранутых у жаночае адзенне, у якасці «прынады» для рабаўнікоў і насільнікаў. Аб гэтым паведаміла нядаўна амерыканская газета «Інтэрнэшнл геральд трыбюн».

№ 13 ПРЫНОСІЦЬ ШЧАСЦЕ

У саставе многіх хакейных каманд, што прыехалі ў Корціна д'Ампеца, не было спартсменаў, якія гулялі пад нумарам 13 — ні ў камандах Канады, ні ЗША. І спартсмены і кіраўнікі лічылі, што трынаццаты нумар нічога добрага не прынясе.

Якое ж было здзіўленне канадцаў і амерыканцаў, калі яны ўбачылі, што ў савецкай камандзе пагарджаюць «дакладнейшымі» прыкметамі: Юрый Панцюхоў іграе пад трынаццатым нумарам. А затым яны атрымалі магчымасць пераканацца ў тым, што і «дакладнейшыя» прыкметы падводзяць. Маючы ў сваім саставе іграка з нумарам 13, савецкая каманда абыграла ўсіх сапернікаў і стала алімпійскім чэмпіёнам. Шмат шайб у вароты сапернікаў закінуў Панцюхоў.

ВІСКІ З АРКТЫЧНЫМ ЛЁДАМ

У адным з японскіх універмагаў у другой палове снежня з'явіўся ў продажы незвычайны тавар: дзвюхтысячагадовай даўнасці арктычны лёд з Грэнландыі. Камерсанты рэкамендуюць гэту старажытнасць не ў якасці музейнага экспаната і не для вывучэння ў лабараторыях, а для прыгатавання віскі з лёдам. За кілаграм такога лёду трэба заплаціць 600 іен.

Міжы намі

Працуе машына, якая замяняе працу ста чалавек, а навокал стаяць сто чалавек і глядзяць, як яна працуе.